Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 209 (4114)
АУТОРАК, 4 жніўня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

15-ТЫ ДЗЕНЬ МЕСЯЧНІКА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ І САМАПРАВЕРКІ

РЭЧЫЦА СКОНЧЫЛА ЖНІВО АЗІМЫХ І УБІРАЕ ЛЕН

Калгас „Ударнік", Гарадоцкага раёну, паказаў узор барацьбы за ўдарную ўборку. Адстаючыя калгасы гэтага раёну, бярэце прыклад з калгасу „Ударнік"!

ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ГОРАДУ І ВЁСКІ,—У НАСТУПЛЕНЬНЕ НА ШКОДНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАЛЁЎ!

Жыта ўбрана

ГАРАДОК. (Ад наш. спец. кар.). Калгас «УДАРНІК», Віраўлянскага сельсавету, арганізаваўся толькі 25-га мая 1931 г. і на сёнешні дзень складаецца з 21 бядняцка-серадняцкай гаспадаркі. Гэты параўнальна малады калгас паказвае прыклады сапраўды сацыялістычнай працы, прыклады энтузіязму і бальшавіцкай настойлівасьці.

У калгасе «Ударнік» па ініцыятыве дзяўчат арганізавалася брыгада жанцоў. Брыгада высунула СУСТРЭЧНУЮ НОРМУ: ЗЖАЦЬ 5 ГЭКТ. ЖЫТА ЗА 2½ ДНІ ЗАМЕСТ ВЫЗНАЧАНЫХ ПЛЯНАМ 4 ДЗЁН.

У выніку правільнай арганізацыі работы па жніве на аснове зьдзельшчыны КАЛГАС «УДАРНІК» КАНЧАЕ ЎБОРКУ ЖЫТА 3-га ЖНІЎНЯ ЗАМЕСТ 5-га ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ.

УДАРНАЯ БРЫГАДА ЖАНЦОЎ УЗЯЛА НА СЯБЕ АБАВЯЗАК НЯ ЗЬНІЖАЦЬ ТЭМПАЎ І НА ЎБОРЦЫ ІЛЬНУ. Ільну ў калгасе 19 гэкт. Трэба, каб «Ударнік» перанёс свой вопыт на іншыя адстаючыя калгасы.

А. Мікуцкі.

На ўборцы.

Аўтадор павінен быць у першых радох

БАРАЦЬБІТОЎ ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ УРАДЖАЙ

ЦП Аўтадору БССР, запрапанаваўшы ўсім сваім арганізацыям на мясцох уключыцца ў барацьбу за ўборку сацыялістычнага ўраджаю і ўдарнае правядзеньне асеньняй сяўбы, намеціла рад канкрэтных мерапрыемстваў.

У барацьбе за выкананьне задач уборачнай і асеньняй сяўбы аўтадораўцы павінны ісьці на чале ўдарнікаў, высокіх тэмпаў і лепшай якасьці, павінны стаць арганізуючым зьвяном сацспаборніцтва ўсіх рабочых саўгасаў, усіх калгасьнікаў, трактарыстаў і г. д.

Аддзяленьні т-ва павінны распрацаваць выразныя апэрацыйныя пляны ўдзелу Аўтадору, стварыць штабы дапамогі бягучым кампаніям.

Аўтадораўскія рамонтныя брыгады павінны прыцягнуць да рамонту курсы шофэраў і трактарыстаў, а таксама аўтадораўскі актыў спэцыялістаў.

Праверыць падрыхтаванасьць аўтатранспарту для перавозкі ўборачных грузаў і збожжазагатоўчых грузаў. Неабходна таксама скарыстаць аўтадораўскія машыны для перакідкі грузаў.

Аўтадораўскія арганізацыі павінны дапамагчы ліквідацыі прарываў у мясавай падрыхтоўцы тэхнічных кадраў. Трэба дабіцца поўнай ліквідацыі абязлічкі і ўвядзеньня спаранай язды на трактарах і аўтамашынах. Кожная машына павінна быць прымацавана да асобных рулявых і рамонтных брыгад.

Выкананьне праграмы конкурсу на лепшую трактарную брыгаду і ўдарніка-трактарыста, абвешчанага ЦС Аўтадору, павінна быць пастаўлена на службу ўборачнай кампаніі.

Абавязак аўтадораўцаў — праверыць становішча падъезных шляхоў, найбольш зьвязаных з уборачна-транспартнымі работамі, арганізаваць рамонт іх сіламі мясцовага насельніцтва, праўленьняў калгасаў і адміністрацыі саўгасаў.

Аўтадораўцы павінны быць ня толькі арганізатарамі, але і непасрэднымі ўдзельнікамі ўсіх дарожных работ.

Неабходна дабіцца найвышэйшай сутачнай працяжнасьці работы кожнага трактара, аўтамабіля і найбольшай загрузкі машыны за ўборачны сэзон (да 21 гадз. у суткі). Трэба дабіцца работы трактара па абмалоце адразу дзьвюма малатарнямі. Арганізаваць такім чынам работу, каб поўнасьцю скарыстаць сутрэчныя рэйсы машын.

Аўтадораўцы павінны разгарнуць шырокую арганізацыйна-растлумачальна-масавую работу, зьвязаную з правядзеньнем бягучых кампаній, адначасова скарыстоўваючы не таксама, як сродак для ўзмацненьня работы аўтадораўскіх арганізацый, для ўтварэньня новых ячэек т-ва, у першую чаргу пры саўгасах, калгасах і МТС, для ўдагненьня ў Аўтадор новых тысяч рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў.

Варашылаўскія суботнікі

МАГІЛЕЎ. Байцы зборнага батальёна №-скага стралковага палка ўзялі шэфства над саўгасам «Буйнічы», Магілеўскага раёну, паставіўшы перад сабою задачу—аказаць саўгасу практычную дапамогу ў правядзеньні ўборачнай кампаніі. Гэту задачу чырвонаармейцы з посьпехам ажыцьцяўляюць. Да гэтага часу імі зроблена ў саўгас 7 выездаў, у часе якіх прапрацаваны 452 чалавекадні. Сіламі чырвонаармейцаў у саўгасе выкапаны 2 сіласныя ямы, скошаны і ўбраны 4 гэкт. канюшыны і 25 гэкт. сенажаці.

Апрача гэтага чырвонаармейцы наладзілі 2 нядзельнікі ў чырвонаармейскай камуне. У нядзельніках прымала ўдзел 120 асоб.

103.000 сярпоў — замест 303.000

адгружана Белкаапсаюзам у раёны

Пачалася ўборачная кампанія. Значная частка ўраджаю ўбіраецца буйнымі машынамі, аднак, асноўная маса ўраджаю яшчэ павінна ўбірацца рукамі. Таму патрэбна выразная работа арганізацый, якія забясьпечваюць сельскую гаспадарку дробным с.-г. інвэнтаром.

Між тым, на справе гэта далёка ня так. Белкаапсаюз павінен быў адгрузіць 303.000 штук сярпоў; адгрузіў-жа толькі 103 тысячы; рыдлёвак замест 137 тон—9 тон.

Вяровак адгружана 90 тон замест 350 тон.

Паводле пастановы СНК БССР ад 18 мая Наркамснаб павінен быў адпусьціць арцелям Белсампрамсаюзу 350 тон сырцу на выраб вяровак. Пастанова гэта ня выканана. З мая месяца цягнецца валынка паміж Белтэкстыльаб'яднаньнем і Наркамснабам аб водпуску кудзелі і ільну для Саюзпраму. Перапіска цягнецца, а 300 тон сырцу Белсампрамсаюз не атрымаў. Выраб вяровак сарваны.

За трэці квартал Белсампрамсаюз абавязаўся адрамантаваць 12 тысяч камплектаў збруі ў сваіх майстэрнях.

Між тым, саўгасы і калгасы патрабуюць водпуску сырамеці, якою яны самі хочуць рамантаваць сваю збрую. У сувязі з вялікім недахватам сырцу гэты зусім няматазгодна, бо арцелі сампрамкаапэрацыі з большай эканоміяй скарыстоўваюць сырамец і іншы матар'ял, які патрэбен для рамонту. З другога боку рабочая сіла калгасаў можа быць скарыстана на ўборку.

Зусім недадушчальна марудна Белсельснаб адгружае калёсныя хады.

У першым і другім кварталах патрэбна было адгрузіць 20.921 калёсны ход, адгружана толькі 9.726. За трэці квартал з запрадгаснага 6.579 штук яшчэ ніводнага не адгружана.

Трэба прыняць самыя энэргічныя настойлівыя меры для неадкладнай адгрузкі сярпоў. Неабходна спыніць плаціню і даць арцелям добраякасны сярэц на выраб вяровак.

А. Л.

Заслаўскі раён праводзіць месячнік на паперы

ЗАСЛАЎЕ, 3. (Па тэлефону). Прайшло 14 дзён месячніка, ужо час праверы і самаправерцы разгарнуцца ва ўсю шырыню. Але на справе Заслаўскі раён уключыўся ў месячнік толькі фармальна. Ні ў адным саўгасе і калгасе ня створаны самаправерачныя брыгады. Вылучаныя штабам работнікі ў большасьці не ўсьвядомілі задач месячніка. З 11-ці вылучаных паехалі толькі 6 чал. За ўвесь гэты час склікана толькі адно арганізацыйнае пасяджэньне.

Вынясная брыгада «Зьвязды»:
Фрадзін, Вішнеўскі.

Рэчыца скончыла ўборку азімых

РЭЧЫЦА. (Па тэлеграфу).

Уборка азімых у Рэчыцкім раёне скончана. Заканчваецца ўборка ячменю. Прыступлена да ўборкі аўса і ільну. Разгортваецца ўдарная работа ў калгасах па абмалоце збожжа. Работа праходзіць у дзьве зьмены. Збожжа пастаянна чырвонымі абозамі ў загатоўчыя арганізацыі. Уборка сенажацяй у калгасах скончана. У аднаасобнікаў убрано толькі 70 проц.

Мацур, Мацкевіч, Саланец

За сацыялістычную жывёлагадоўлю

КАЛГАС ІМЯ КАЛІНІНА—

ПРЫКЛАД УСІМ КАЛГАСАМ БССР

Ён па-баявому разгарнуў будаўніцтва і камплектаваньне малочнай і сьвінагадоўчай фэрмы

Калгас імя КАЛІНІНА, Рэчыцкага раёну, заключыў дагавор на арганізацыю сьвінагадоўчай і малочнай таварных фэрм і адразу-ж пасьля скончэньня сяўбы па-баявому разгарнуў будаўніцтва. З саміх калгасьнікаў арганізавана 5 брыгад цесьляроў. Будуюцца сьвінарнікі, скотны двор і стайня. Будаўніцтва сьвінарнікаў ужо заканчваецца.

Калгас «Калініна» паказаў прыклад, як трэба праводзіць укамплектаваньне. У сьвінагадоўчай фэрме ёсьць 80 сьвіноматак, трэба-ж паставіць звыш 200. Гэта пытаньне абмяркоўвалася на сходзе калгасьнікаў, якія заявілі: «Самі ўкамплектуем». Сходам прынята прапанова, каб калгасьнікі, якія маюць па 2 сьвіні, адну здаюць на фэрму. Калі сьвіноматка дасьць прыплод, калгас згодна абавязацельства перадае калгасьніку сьвіню роўную па вазе тэй, якая была калгасьнікам здана на фэрму.

На сходзе аднаго з вучасткаў калгасу 20 калгасьнікаў ужо абавязаліся ўкамплектаваць фэрму сваімі сьвінямі.

Малочная фэрма таксама ўкамплектоўваецца. Ужо ёсьць звыш 170 дойных кароў і 160 цялят.

Калгас імя Калініна буйнейшы ў БССР—ён яднае 250 двароў на плошчы ў 4.000 га.

О—ка.

Замест сьвінарнікаў—будуюць дачы

У Менскім раёне будаўніцтва скотных двароў у калгасах разгортваецца вельмі марудна. Калгасы «Чырвоны пуцілавец» і «Сталіна» да будаўніцтва яшчэ не прыступілі. У калгасах «Бальшавік», «Чырвоны барацьбіт» і «Прагрэс» толькі зараз пачалі будаваць аборы. У калгасе «Бальшавік» замест абор будуюць дачныя памяшканьні. Калгас «Чырвоны пуцілавец» зацягнуў будаўніцтва з прычыны несвачасовага водпуску матар'ялаў лесправмгасам.

Праўленьне Менскага райкалгасаюзу пастанавіла прыцягнуць да судовай адказнасьці праўленьне калгасу «Бальшавік» за зрыў плянавага будаўніцтва.

Старшыні калгасу «Сталіна» — Галкоўскаму, «Прагрэс»—Бабруйскаму і «Чырвоны барацьбіт»—Карнейчыку абвешчана вымова з папярэджаньнем, калі на працягу 5 дзён ня будзе распачата будаўніцтва, справа будзе перадана пракурору.

Толькі 5 калгасаў пачалі будаўніцтва

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.).

У Гомельскім прыгарадным раёне з 15 калгасамі заключаны дагавары на арганізацыю 15 таварных малочных фэрм. З 15 калгасаў разгарнулі будаўніцтва толькі 5. «Чырвоны гэрой», «Чырвоны берег», «Чырвоны працаўнік», «Камуна» і «Шлях да сацыялізму».

Але побач з гэтым ёсьць рад калгасаў: «Піянэр», «Чырвоная зорка», «Чырвоны хлебароб», якія яшчэ ў мінулым годзе пачалі будаўніцтва скотных двароў і ніяк іх ня могуць скончыць.

Малочныя фэрмы ўкамплектаваны толькі на 50 проц.

Калгасы «Чырвоны маяк» і «Пралетар», якія заключылі дагавары на арганізацыю сьвінагадоўчых фэрм, таксама не разгарнулі будаўніцтва сьвінарнікаў.

Зрушыць уперад

БАРЫСАЎ. Будаўніцтва сьвінарнікаў і абор для СТФ і МТФ ідзе чарапашымі тэмпамі. Паводле пляну ў раёне трэба пабудаваць у гэтым годзе 44 сьвінарнікі на 2.895 штук. На сёнешні дзень будуецца толькі 3 сьвінарнікі і 12 прыстасоўваюцца.

Ня лепш і з аборамі. Трэба пабудаваць 16 абор, пабудаваны-ж 2 і 4 прыстасаваны.

Рад калгасаў, дзе трэба будаваць сьвінарнікі і аборы яшчэ не прыступілі да будаўніцтва, а дзе і пачалі («Рой», «Шлях Леніна»), дык выканалі будаўніцтва толькі на 25 проц.

Трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на будаўніцтва МТФ і СТФ, зрушыць яго з месца.

П. КРЫВІЦА.

Без уліку няма зьдзельшчыны

ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА ІСНУЕ ТОЛЬКІ ТАМ,

ДЗЕ САПРАЎДЫ ЎЛІЧВАЕЦЦА ВЫПРАЦОЎКА КОЖНАГА КАЛГАСЬНІКА

З 39 калгасаў толькі 5 сапраўды на зьдзельшчыне

УВАРАВІЧЫ. Ва Ўваравіцкім раёне калектывізавана звыш 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У ім налічваецца 39 калгасаў. Паводле вестак райкалгасаюзу 27 калгасаў раёну пераведзены ўжо на зьдзельшчыну. Але калі праверыць гэтыя весткі, дык аказваецца, што ў пераважнай колькасьці калгасаў зьдзельшчына праведзена фармальна. Толькі ў 5 калгасах у аснову ўліку працы пакладзена яе колькасьць і якасьць. Такую пастаноўку работы мы маем у калгасе «Вэкэр».

Значнай перашкодай у справе ўкараненьня ў работу калгасаў зьдзельшчыны зьяўляецца тое, што ва многіх калгасах раёну яшчэ дагэтуль няма прыкладных норм выпрацоўкі. Звычайна нормы выпрацоўкі ўстанаўляюцца праўленьнем без удзелу калгасьнікаў, што прыводзіць да вялікіх непаразуменьняў.

У калгасах Уваравіцкага раёну не праводзіцца ніякай культмасавай работы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута. Прадысцыплціна ў большасьці выпадкаў на вельмі нізкім узроўні.

Ня гледзячы на тое, што райкалгасаюз мае ў сваім распараджэньні 5 агранамаў і 6 інструктароў, кіраўніцтва з яго боку калгасамі пастаўлена дрэнна. Прадстаўнікі райкалгасаюзу звычайна прыяжджаюць у калгасы на 2-3 гадз. і такім чынам не аказваюць праўленьням калгасаў належнай дапамогі ў справе падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю.

Райкалгасаюз павінен забясьпечыць неадкладны пераход калгасаў Уваравіцкага раёну на сапраўдную зьдзельшчыну. Па апартуністах, якія недаацэньваюць зьдзельшчыну, трэба ўдарыць са ўсёй рашучасьцю. Трэба памятаць, што толькі правільная арганізацыя работы і расстаноўка сіл зьяўляецца зарукай пасьпяховага праведзеньня важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Казіміраў.

Точка нажоў жнеяркі.

Усім раённым штабам па правядзеньні месячніка генэральнай праверкі

5-га ЖНІЎНЯ РАЁННЫЯ ШТАБЫ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ ПЕРШУЮ СПРАВАЗДАЧУ АБ ПРАРОБЛЕНАЙ РАБОЦЕ ЗА 15 ДЗЁН МЕСЯЧНІКА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ І САМАПРАВЕРКІ. ДЛЯ ГЭТАЙ МЭТЫ РЭДАКЦЫЯЙ «ЗЬВЯЗДЫ» РАЗАСЛАНЫ БЛЯНКІ «РАПАРТАЎ СПРАВАЗДАЧ» УСІМ РАЁННЫМ ШТАБАМ. ПА АТРЫМАНЬНІ БЛЯНКАЎ РАЁННЫЯ ШТАБЫ ПАВІННЫ ІХ ЗАПОЎНІЦЬ І ВЫСЛАЦЬ У РЭДАКЦЫЮ НЕ ПАЗЬНЕЙ 6-га ЖНІЎНЯ. У ВЫПАДКУ НЕАТРЫМАНЬНЯ БЛЯНКАЎ НЕАБХОДНА ЗАРАЗ-ЖА ТЭЛЕГРАФНА ПАВЕДАМІЦЬ РЭДАКЦЫЮ «ЗЬВЯЗДЫ».

На барацьбу са стратамі

ЯК ПАБУДАВАЦЬ ЗЕРНЯЎЛАВІЦЕЛЬ

Пры цяперашніх спосабах уборкі збожжа самаскідамі і снопавязалкамі ў гарачае падвор'е, асабліва сьпелага, трацілася частка зярнят, якія пры скідваньні збожжа з пляцформы зьмятаюцца разам з ім і застаюцца на полі.

Каб унікнуць гэтых страт зярнят, неабходна прыстасаваць да жнівярак зерняўлавіцелі, якія, дзякуючы прастаце сваёй канструкцыі, могуць быць зроблены ў кожнай гаспадарцы.

Зерняўлавіцель, як паказана на малюнку, прадстаўляе драўляную скрынку, зьбітую з дошак. Шырыня скрынкі ўнутры робіцца ў 35 см., а глыбіня ў 12 см. Даўжыня скрынкі робіцца з такім разьлікам, каб яна поўнасьцю адпавядала даўжыні боку пляцформы самаскідкі, з якое скідаюцца снапы.

Верх скрынкі ўдоўж на шырыню ў 15 см. перакрываецца двухсантымэтравай дошкай, а 20 см. абцягваюцца дротавай сеткай прасьветам каля 12 кв. м. м.

Тарцы скрынкі робяцца з больш моцных і тоўстых каля 2½ сантымэтравых дошак; бакавыя-ж дошкі бяруцца больш танчэйшыя і лягчэйшыя. Драцяную сетку можна браць ад сіт старых арфаў з адпаведнымі прасьветамі.

У дне, з таго боку, што ставіцца да грабельнай стойкі, прарэзваецца дзірка разьмерам 20×20 см., якую закрываюць бляшанай або драўлянай засаўкай праз прарэз з боку барта скрынкі і якая служыць для апарожніваньня зерняўлавіцеля.



Мадэль зерняўлавіцель

Для ўмацаваньня на месцы зерняўлавіцель падстаўляецца пад пляцформу з таго боку, з якога скідаюцца снапы, з такім разьлікам, каб дошка крышкі хавалася пад пляцформай і зьвінчваюць некалькімі 5 см. трубамі, якія прапускаюцца праз дошкі пляцформы ў дошку крышкі зерняўлавіцеля.

Сетка такім чынам служыць працягам пляцформы і стаіць невялічкім уступам ад канца яе і падаўжае пляцформу на 19-20 см.

Зьявілася вусень і лугавы матыль

ЛЕПЕЛЬ. (БЕЛТА). На раёне зьявілася ў вялікай колькасьці вусень і лугавы матыль. Зьнішчана 250 га насеньня турнэпсу. Шкоднікі пачынаюць пераходзіць на бульбу, лён і інш. культуры. Працуюць толькі 12 апырскальнікаў.

Патрабуецца тэрміновая дапамога сродкаў барацьбы са шкоднікамі. Адсутнічаюць апаратура і атрутныя сродкі.

Пастанова СНК БССР

У сувязі з раптоўным паяўленьнем у вялікай колькасьці рапсавага піпільніка і капуснага беляна ў раёнах БССР, якія пагражаюць зьнішчэньнем гародных культур, Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Назначыць намесьніка народнага камісара зямляробства—тав. Масюкова асобным упаўнаважаным для барацьбы з рапсавым піпільнікам і капусным беляном.

2. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Зямляробства на працягу 24-х гадзін мабілізаваць 75 аграномаў для работы па барацьбе з рапсавым піпільнікам і капусным беляном.

3. НК Зямляробства абвясьціць раёны, ахопленыя паказанымі шкоднікамі, на асобным становішчы ў сэнсе барацьбы са шкоднікамі.

4. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам выдаць абавязковыя пастановы аб мабілізацыі насельніцтва на правядзеньне барацьбы з рапсавым піпільнікам і капусным беляном у парадку працоўнай павіннасьці.

5. Выдаць Народнаму Камісарыяту Зямляробства 75 тыс. руб. для барацьбы з паказанымі шкоднікамі.

6. Прапанаваць упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Шляхоў пры СНК БССР перавозіць людзей і сродкі барацьбы са шкоднікамі бяз усякай чаргі.

7. Абавязаць кантору сувязі без чаргі дастаўляць пошту і тэлеграмы, якія адпраўляюцца Беларускім аддзяленьнем «АБШ» з надпісам «Сродкі змаганьня».

8. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам на працягу сутак даць Беларускаму аддзяленьню «АБШ» весткі аб заражаных і апрацаваных плошчах і даваць такія весткі па тэлеграфу праз кожныя 3 дні.

9. Абавязаць цэнтральны і раённы друк асьвятляць пытаньні барацьбы са шкоднікамі.

Прапанаваць Беларускаму Дзяржаўнаму Выдавецтву не пазьней, як праз 5 дзён, выпусьціць зборнік па барацьбе са шкоднікамі.

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. БЭНЭК.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

АБ ВЫТВОРЧЫХ ЗАДАЧАХ РАБКОРАЎ МЭТАЛЯПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР

ПАСТАНОВА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ

1. Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка 1931 году аб перабудове рабселькораўскага руху патрабуе, у прыватнасці, і ад рабкораў-металістаў базадкладна шчыльна падчапіцьці да канкрэтных вытворчых задач свайго галіны прамысловасьці.

Металяпрамысловасьць БССР, як і ўся прамысловасьць Савецкага Саюзу ў цэлым, увесь час ідзе па шляху няўхільнага росту (з 3¼ млн. руб. прадукцыі ў дарэвалюцыйны час да 35 млн. руб. у 1930 г.).

Партыяй і ўрадам пастаўлены перад металяпрамысловасьцю адказнейшыя задачы ў справе ажыцьцяўленьня сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Металяпрамысловасьць БССР у 1931 годзе павінна дасягнуць росту на 63 процанты.

Зьніжэньне **сабекошту** ў бягучым годзе павінна быць праведзена ня менш чым на 11 проц.

Між тым, сваё вытворчае заданьне на першае паўгодзьдзе 1931 году металяпрацоўчая прамысловасьць БССР выканала **толькі ка 64,2 проц.**

Ня гледзячы на тое, што выпушчаная прадукцыя складае 135,8 проц. у параўнаньні з першым паўгодзьдзем 1930 году,—такое становішча нельга ні ў якім разе лічыць здавальняючым з пункту гледжаньня заданьняў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Буйнейшы прарыў у справе выкананьня металяпрацоўчай прамысловасьцю БССР свайго прамфінпляну павінен прыкаваць да сябе ўвагу ўсяго нізавога друку, павінен паставіць увесь нізавы друк, усіх рабкораў-металістаў у рады перадавых ударнікаў пад кіраўніцтвам партыі за ліквідацыю прарываў, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну па ўсіх без выключэньня колькасных і якасных паказальніках.

Увесь друк, усе рабкоры-металісты павінны пад кіраўніцтвам КП(б)Б павесьці яшчэ больш узмоцненую барацьбу з праяўленьнямі апартуністычных тэндэнцый з існуючымі спробамі апраўдаць прарывы выключна недахватам сырцу.

Рабкоры-металісты павінны даваць самы рашучы, руйнуючы адпор узьнікаючым на гэтай глебе наскрозь апартуністычным «тэорыям» аб беспэрспэктыўнасьці металяпрамысловасьці.

Рабкоры-металісты павінны ў яшчэ большай меры зьявіцца непасрэднымі памочнікамі партыйных арганізацый у барацьбе за перамаганьне труднасьцяй, якія зьяўляюцца труднасьцямі росту і якія маюць частковы і часовы характар.

Накіруем усю волю, усе сілы, усю энэргію для забесьпячэньня поўнага выкананьня прамфінпляну (па ўсіх паказальніках) пры найбольш поўным выкарыстаньні наяўных магчымасьцяй і рэсурсаў, якія забясьпечваюць выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

«Нашы труднасьці зьяўляюцца такімі труднасьцямі, якія самі маюць у сабе магчымасьці іх перамаганьня, г. зн., што адначальная рысай нашых труднасьцяй зьяўляецца тое, што яны самі даюць нам базу да іх перамаганьня. (Сталін).

Усю работу рабкораў і рэдкалегій трэба разам з далейшым, самым шырокім разгортваньнем пралетарскай самакрытыкі і барацьбою за яе дзейснасьць таксама прасякнуць арганізацыяй самага шырокага, сыстэматычнага, разгорнутага паказу праз друк прыкладаў бальшавіцкага змаганьня за прамфінплян, трэба прасякнуць мыбокім і грунтоўным абменам вопыту паасобных прадпрыемстваў, паасобных цэхаў і брыгад, паасобных рабочых-ударнікаў.

У аснове ўсёй работы рабкораў, рэдкалегій і ўсяго нізавога друку павінны легчы ўказаньні, даныя правадыром партыі **тав. Сталіным** у прамове, зробленай на нарадзе гаспадарнікаў 23 чэрвеня бягучага году.

Рабкоры і ўвесь нізавы друк павінны стаць застрэльшчыкамі ў ажыцьцяўленьні новых задач гаспадарчага будаўніцтва, якія вынікаюць з новай абстаноўкі. Прамова тав. Сталіна зьяўляецца для кожнага рабкора, пасьцвгазэты, шматтыражкі балвым кіраўніцтвам у штодзённай рабоце, магутнейшым вагаром у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

2. Асноўны ўпор неабходна зрабіць на наступных вузлавых праблемах разьвіцьця металяпрацоўчай прамысловасьці БССР, зьвязваючы ажыцьцяўленьне ўсіх гэтых праблем **з самай неаслабнай і пасьлядоўнай барацьбой** за якасьць, за самае непасрэднае, арганічнае адучэньне высокіх колькасных і якасных паказальнікаў:

а) Затрудненьне з сырцом ставіць з яшчэ большай вострасьцю праблему поўнай мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў. Барацьба за эканомію мэтэлю, за ўтылізацыю ўсіх няходкіх профіляў жалеза і сталі, замену мэталяў новымі матар'ялямі (у прыватнасьці, укараненьне ў машына-будаўніцтва дрэва і жалеза-бэтону), правільнае разьмеркаваньне сырцовых рэсурсаў, барацьба са звышнармальнымі запасамі, шырокае разгортваньне рацыяналізатарскай работы, укараненьне стандартызацыі, безадкладнае ажыцьцяўленьне рабочых рацыяналізатарскіх прапаноў, барацьба за самую жорсткую эканомію апалу—вось адны з важнейшых пытаньняў зьместу штодзённай работы ўсяго фабрычна-заводзкага друку, усёй масы рабкораў-металістаў.

б) Спэцыялізацыя заводу мае вялізарнае значэньне для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, у прыватнасьці, для спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі БССР у напрамку жывёлагадоўлі, тэхнічных культур і гародаў.

Фабрычна-заводзкія газэты і ўсе рабкоры-металісты павінны самым наасцаблным чынам весьці змаганьне як з тэндэнцыямі правесьці спэцыялізацыю габінэтным, бюракратычным чынам, таксама і з праяўленьнямі цэхаўшчыны як у часе падрыхтоўкі, так і ў часе непасрэднага праведзеньня спэцыялізацыі заводаў, нежаданьне выходзіць з інтарэсаў усёй металяпрамысловасьці, усёй народнай гаспадаркі ў цэлым:

Рабкоры заводаў сельска-гаспадарчых машын! Рабкоры заводу «Гомсельмаш»! Завострым праз друк і асабістым прыкладам увагу на максімальных колькасных і якасных паказальніках выкананьня пляну выпуску сельска-гаспадарчых машын, у прыватнасьці, сілосарэзак, на хутчэйшым выкананьні заданьняў і іх самых высокіх якасных паказальніках.

Цьвёрда памятаюць, што зьяўляецеся рабкорамі тых заводаў, якія выробляюць зброю зьнішчэньня векавой кабалы і дзікунства, тых заводаў, якія выробляюць зброю сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Рабкоры, працуючыя на будаўніцтве варштатаў! Завострым праз друк і асабістым прыкладам увагу на выкананьне якасьці, колькасьці спрашчэньня стандартызацыі і ўзаемазамяняемасьці дэталяй і паляпшэньня якасьці замены мэталю іншымі матар'ялямі, даб'ецца поўнага разьмеркаваньня працы.

Рабкоры, працуючыя па вырабе торфмашын! Завострым праз друк і асабістым прыкладам увагу па паляпшэньні рэканструкцыі машын, за высокую якасьць выпусканых машын, шчыльна зьвязваючыся з газэтамі і рабкорамі торфаразпрацовак для выяўленьня і безадкладнага выпраўленьня недахопаў машын.

Барацьба за добраякасную, выпупчаную да сэзону тарфяную машыну—ёсьць адна з адказнейшых частак барацьбы за нератварэньне Савецкай Беларусі ў тарфяны Данбас.

в) Паляпшэньне арганізацыі працы і апэрацыйнага і тэхнічнага кіраўніцтва—адно з рашаючых зьвеньняў ва ўсёй справе далейшых посьпехаў металяпрамысловасьці.

Рабкоры павінны праз друк змагацца за тое, каб «арганізаваць працу на прадпрыемствах такім чынам, каб прадукцыйнасьць працы расла з месяца ў месяц, з кварталу ў квартал» (Сталін).

Рабкоры і ўвесь нізавы друк павінны павесьці **самую рашучую барацьбу з аблэшчнай,** гэтым бічом вытворчасьці, гэтай «незаконнай спадарожніцай бесьперапынкі», дабіваюцца паляпшэньня і канкрэтызацыі кіраўніцтва ўсіні зьвеньнямі прамысловасьці, змагацца за тое, каб нашы гаспадарчыя кіраўнікі прадпрыемстваў кіравалі не «наогул», не з «паветра», а канкратна, прадметна» (Сталін).

Асноўныя прычыны прарываў у прамфінпляне—слабое ажыцьцяўленьне адзінапачальня, недахопы кіраўніцтва, невыстарчальная яго канкрэтызацыя, праяўленьні няўменьня па-бальшавіцку мабілізаваць масы ўдарнікаў на мэтаімкнёнае вырашэньне балвых задач сёнешняга дня сацыялістычнага будаўніцтва.

У прыватнасьці патрэбна на старонках фабрычна-заводзкіх і цэхавых газэт завастрыць увагу на пытаньнях рашучага і вычарпальнага паляпшэньня кіраўніцтва начнымі зьменамі.

Кожны рабкор павінен быць ударнікам плянаваньня, ударнікам праверкі выкананьня.

— Ажыцьцёвім поўнае міжцэхавае і цэхавае плянаваньне.

— Максімальна паскорым вытворчыя працесы і зьменным аб'ём зваротных сродкаў вытворчасьці.

— Поўнасьцю вывучым і скарыстаем абсталяваньне і карысную плошчу цэхаў, складаў тэрыторый заводаў.

— Жорстка і настойліва ўкаранім ва ўсе часткі заводзкага мэханізму прынцыпы гаспадарчага разрахунку.

Адным з важнейшых зьвеньняў у паляпшэньні тэхнічнага кіраўніцтва, за якое павінен змагацца фабрычна-заводзкі друк, зьяўляецца таксама і прымацаваньне інжынэраў і тэхнікаў да поўных машын з мэтай выручэньня гэтых машын і ўнясеньня канструкцыйных зьмен.

г) Барацьба за кадры — балвая задача ўсяго друку, усіх рабкораў-металістаў.

Ліквідацыя ў савецкай краіне беспрацоўя **па-новаму паставіла** пытаньне забесьпячэньня прадпрыемстваў рабочай сілай.

Рабкоры павінны праз друк разгарнуць барацьбу за **арганізаваны** прыток рабочай сілы шляхам дагавораў гаспадарнікаў з калгасамі. Рабкоры-металісты павінны змагацца за заключэньне гэтых дагавораў з калгасамі, якія зьяўляюцца спажыўцамі тых сельска - гаспадарчых машын, якія вырабляюцца металяапрацоўчай прамысловасьцю.

Перад нізавымі газэтамі і рабкорамі стаіць адказная задача **барацьбы з цякучасьцю рабочай сілы,** якая часта нараджаецца наяўнасьцю дробна-буржуазнай **ураўнілаўкі ў зарплаце,** разрывам паміж кваліфікаванасьцю і якасьцю працы і зарплатай. «Каб зьнішчыць гэта зло, трэба скасаваць ураўнілаўку і разьбіць старую тарыфную сыстэму» (Сталін).

Рабкоры і нізавы друк павінны змагацца за правільнае ўстанаўленьне **расцэнак і норм выпрацоўкі,** за поўнае ажыцьцяўленьне ў зарплаце прынцыпаў **неабмежаванай зьдзельшчыны,** за пашырэньне вопыту **прэміяльна-прагрэсыўнай сыстэмы** аплаты працы.

Нізавыя газэты і рабкоры павінны ўзяць пад нагляд газэт пастаноўку вучэбнай справы, шырока абгаворваць у друку пытаньні падрыхтоўкі рабочых тых спэцыяльнасьцяй, якія найбольш неабходны для металяпрамысловасьці, дапамагаючы разам з гэтым у арганізацыі праз друк грамадзкага падбору лепшых кандыдатур для пасылкі на вучобу. Завастраючы ўвагу на пытаньнях падрыхтоўкі кадраў, нізавы друк павінен жорстка бічаваць прагульшчыкаў, рвачоў і лятуноў—дэзарганізатараў вытворчасьці, павінен весьці барацьбу з усялякімі формамі цякучасьці рабочай сілы.

З Праводзячы ўсю сваю работу вакол гэтых вузлавых задач, пад знакам самай непрымірымай і пасьлядоўнай барацьбы на два фронты, за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу—найбольш небясьпечнага на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў,—нізавы друк і рабкоры-металісты павінны цэнтр увагі сканцэнтраваць на выкананьні канкрэтных вытворчых задач свайго прадпрыемства, цэху, брыгады і рабочага месца, узьнімаючы барацьбу за поўнае выкананьне гэтых задач на вышыню барацьбы за выкананьне бальшавіцкай пяцігодкі, на вышыню барацьбы за перамогу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Рабкоры — застрэльшчыкі ў справе аўладаньня ўсёй масай рабочых, усімі гаспадарнікамі тэхнікай сваёй спэцыяльнасьці, перадавым барацьбітам неаслабнага змаганьня за якасьць, за колькаснае і якаснае выкананьне прамфінпляну, за яго выкананьне і перавыкананьне.

Рабкоры-цыклёшчыкі! Галоўную ўвагу рабкораў-ліцейшчыкаў канцэнтруйце як праз заводзкія і насьценныя газэты, так, разам з гэтым і абавязкова, асабістым прыкладам, на барацьбе з бракам, на яго ўліку, на вывучэньні прычын і зьнішчэньні іх. Разгорнем работу на аўладаньні тэхнікай фармоўкі, заліўкі і выбаркі, арганізуем тэхнічныя гурткі, вылучым галавіну тэхнікі.

Рабкоры - токары! На барацьбу за плянавасьць, за якасьць у рабоце, за поўную ўвязку паміж цэхамі. Арганізуем, апрача ўнутры-цэхавых газэт, яшчэ адну аб'яднаную газэту некалькі цэхаў—барацьбіта за дасягненьне поўнай увязкі паміж тымі цэхамі, якія залежаць адзін ад аднаго.

Барацьба за правільнае скарыстаньне варштатаў і за ліквідацыю абязьлічкі ў карыстаньні імі, за поўнае скарыстаньне іх магутнасьці, дакладнае вывучэньне варштатаў, барацьба за зьберажэньне абсталяваньня і яго пашпартызацыю, за поўную загрузку і сярыйнае выкананьне заказаў — вось тое кола пытаньняў, на якіх рабкоры-токары праз друк і, разам з тым абавязкова, асабістым прыкладам мабілізуюць асаблівую ўвагу ўсіх токараў.

Рабкоры-сьлесары! Рабкоры-зборшчыкі! Шляхам стварэньня кантрольных пастоў друку ў такарных цэхах даб'емся свячасовага забесьпячэньня брыгад дэталямі, даб'емся кантролю над іх якасьцю. Пашырэньне сеткі «сквозных» брыгад токараў і рабочых сьлясарна-зборачнага цэху, увяньцце якасьці іх работы і сыстэматычны паказ праз друк іх дасягненьняў—адна з важнейшых задач рабкораў гэтых прафэсій.

Рабкоры-кацэльшчыкі! Завастрайце праз друк, завастрайце разам з тым абавязкова асабістым прыкладам, увагу на рашучай барацьбе за далейшае ўкараненьне электразваркі, за найбольшую эканомію мэталяў, за мабілізацыю ўсіх унутраных рэсурсаў. Перавторным заводзкія і цэхавыя газэты ў сапраўдных арганізатараў настойлівай барацьбы за самую жорсткую эканомію каляровых мэталяў і замену іх іншым сырцом, за самы пырокі абор прапаноў па гэтым пытаньні і за хуткае, поўнае ажыцьцяўленьне ўсіх лацчых каштоўнасьць рацыяналізатарскіх прапаноў.

Рабкоры заводу імя Варашылава! Перад вамі стаіць спэцыфічная задача—пырока скарыстаць і праз друк пашырыць вопыт адзінай у металяпрамысловасьці Беларусі хэмічнай лябараторыі (аналіз чыгуну, коксу і фармовачнай зямлі). Правільнае складаньне шыхт і ўлік гатункавасьці чыгуну—неабходная ўмова зьнішчэньня браку. Перад вамі таксама стаіць задача ў далейшым свячасова забясьпечваць гіганты, якія будуюцца, абсталяваньнем.

Рабкоры заводаў масавай вытворчасьці! Увага ажыцьцяўленьню вузкай спэцыялізацыі кожнага рабочага і брыгады (падзел працы), замене брыгад на выпуску гатовай прадукцыі сыстэмаю патоку (асабліва ў зборачных цэхах), удасканаленьню канструкцый дэталяй, што забясьпечвае бесьперабойную зборку.

Рабкоры ўсёй металяпрамысловасьці! Возьмем пад пільны нагляд усяго фабрычнага друку работу кантрольных і тэхнічных аддзелаў і інструментальных майстэрань. Арганізуем на старонках фабрычных шматтыражак і цэхавых газэт масавы агляд-самаправерку работы кантрольных і тэхнічных аддзелаў і інструментальных майстэрань (наколькі яны свячасова правяраюць і выпраўляюць шаблёны і калібры, наколькі правільна прымаюць дэталі і кантралююць якасьць матар'ялаў, наколькі свячасова робіцца праверка чарцяжоў і выпраўляюцца заўважаныя пры практычнай зборцы памылкі і г. д.). Шырока прыцягнем да сыстэматычнага, пастаяннага ўдзелу ў фабрычна-заводзкім друку, у работе ўдарных брыгад друку, у штодзённай рабоце ўсіх рабкораў-металістаў—інжынэрна-тэхнічны і адміністарцыйны пэрсанал.

Рабкоры ўсёй металяпрамысловасьці! Арганізуем сацыялістычны канвэер праверкі і дапамогі справе свячасовага выкананьня заказаў. Прыцягнем для самага актыўнага і непасрэднага ўдзелу ў сацыялістычным канвэеры рабкораў тых заводаў, адкуль атрымліваецца сырэц для металязаводаў. Зьвяжамся з сельскорамі для праверкі якасьці тэй прадукцыі, якая выпускаецца металяпрамысловасьцю БССР.

4. Пытаньням паляпшэньня сыстэматычнай **апэрацыйна-масавай работы** фабрычна-заводзкога друку павінна аддавацца самая сур'ёзная і пастаянная ўвага а боку рэдкалегій насьценных газэт і шматтыражак, таксама, як і з боку ўсіх рабкораў.

Накоплены ў працэсе работы і апраўдушы сябе вопыт павінен быць перанесен на ўсе заводы металяпрамысловасьці. Да такіх форм работы, у прыватнасьці, адносіцца:

а) стварэньне насьценгазэт у брыгадах і зьменах, вучастках;

б) выпуск плякатаў «сыгналаў» і «трывог», як формы **папярэджаньня** прарываў на паасобных вучастках работы (напрыклад, сыгнал аборачнага цэху мэханічнаму, або сыгнал унутры цэху аб пагрозе недахвату дэталяй);

в) арганізацыя апэрацыйных груп і рабкоўскіх пастоў (ня ў выглядзе пастаянных адзінак, а стваряемых для выкананьня поўнага канкрэтнага заданьня) у брыгадах, асабліва ліцейных і загатоўчых цэхаў;

г) арганізацыя «сквозных» брыгад друку, выпуск штодзённых апэрацыйных бюлетэняў, перадатачных сыгналаў, плякатаў і г. д.

Аб мерапрыемствах па ўзмацненьні кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам у БССР

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б

У мэтах замацаваньня і далейшага пашырэньня тэй значнай работы па перабудове рабселькораўскага руху, нізавога друку і ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва ім, якая была праведзена як у часе падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў, так і непасрэднай работы зьезду, ЦК КП(б)Б лічыць неабходным:

1) Агульнае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам БССР ажыцьцяўляецца Культпропам ЦК КП(б)Б і ЦО — газэтай «Зьвязда».

2) Для забесьпячэньня сыстэматычнага і глыбокага штодзённага кіраўніцтва і дапамогі рабселькорам асобных галін прамысловасьці і сельскай гаспадаркі—усилясьці на рэдакцыі цэнтральных газэт адказнасьць за работу з рабселькорамі паасобных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама за кіраўніцтва нізавым друкам гэтых галін народнай гаспадаркі, не аслабляючы разам з тым пастаноўкі і асвятленьня пытаньняў усяго рабселькораўскага руху ў цэлым: а) газэта «Зьвязда» побач з агульным кіраўніцтвам рабселькораўскім рухам БССР таксама ажыцьцяўляе спэцыялізаванае кіраўніцтва рабкорамі і нізавым друкам металяпрацоўчых прадпрыемстваў БССР, новабудоўляў і папяровай прамысловасьці; б) газэта «Савецкая Беларусь» — рабселькоры і нізавы друк савецкіх устаноў, спажывецкай кааперацыі і дрэваапрацоўчай прамысловасьці; в) газэта «Рабочий»—рабкоры і нізавы друк чыгуначнага, водкага і шасэйнага транспарту і гарбарна-абутковай прамысловасьці; г) газэта «Акцябр»—рабкоры і нізавы друк тэкстыльнай і шэйнай галін прамысловасьці; д) газэта «Чырвоная зьмена»—рабкоры і нізавы друк тарфяных заводаў, а таксама індустрыяльных вышэйшых навучальных устаноў; е) газэта «Калгасьнік Беларусі»—рабселькоры і нізавы друк ільнаводчых і жывёлагадоўчых калгасаў; ж) газэта «Сельска-гаспадарчы рабочы Беларусі»—рабселькоры і нізавы друк машынатрактарных станцый і саўгасаў; з) газэта «Орка»—рабкоры і нізавы друк шкляной прамысловасьці.

3. Апрача скліканьня ўсебеларускіх зьездаў рабселькораў адпаведным газэтам разам з Культпропам ЦК КП(б)Б па меры патрэбнасьці, склікаць усебеларускія спэцыялізаваныя нарады рабсельваенкораў у адпаведнасьці з прымацаваньнем да асобных газэт. Камітэту па справах друку пры СНК БССР прадугледзець у бюджэтных асыгнаваньнях на друк выдаткі па скліканьні нарад і зьездаў рабселькораў.

4) Абавязаць рэдакцыі цэнтральных газэт сыстэматычна (ня менш разу ў пяцідзёўку) зьмяшчаць агляды як друку наогул, так і ў асаблівасьці нізавых газэт тэй галіны народнай гаспадаркі, рабкоры якой прымацаваны да пэўнай рэдакцыі. АБАВЯЗАЦЬ РЭДАКЦЫІ ВЫЛУЧЫЦЬ АДКАЗНЫХ ТАВАРЫШОЎ, ЯКІХ ВЫЗВАЛІЦЬ АД УСЯКАЙ ІНШАЙ РАБОТЫ І ЎСКЛАСЬЦІ ПЭРСАНАЛЬНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА КІРАЎНІЦТВА РАБОТАЙ СЯРОД ПРЫМАЦАВАНЫХ ДА ГАЗЭТЫ ГРУП РАБСЕЛЬКОРАЎ.

5. Улічваючы востры недахват адказных работнікаў у складзе цэнтральных газэт і выдозьлучы з неабходнасьці рашучэ ўзмацніць ГЭТЫ, АДЗІН З НАЙБОЛЬШ АДКАЗНЫХ ВУЧАСТКАЎ АГУЛЬНА-ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ — датэрмінова выпусьціць з Камвузу 5 чалавек (з газэтнага аддзяленьня) і накіраваць з агульна-партыйнай работы 5 чалавек, якіх камандураваць у рэдакцыі газэт выключна для работы з рабселькорамі.

6. Абавязаць Белдзяржвыдавецтва ў тэрміновым парадку выпусьціць бібліятэчку брашур з асноўнымі матар'ялямі зьезду.

7. Пастанову апублікаваць.

д) арганізацыя рэйдаў, зьлётаў, буксірных брыгад друку, рабкораўскіх «паходаў», пераклічак, рацыяналізатарскіх рахункаў, пераклічак, конкурсаў, апэцыйных зводак чырвоных і чорных дошак і г. д.;

е) арганізацыя таварыскіх сустрэч удзельнікаў «сквозных» брыгад, правядзеньне гутарак з прагульшчыкамі і лятунамі для выяўленьня прычын, якія іх штурхаюць на гэту справу, пасылка ім лістоў на кватэру і г. д.

5. Задачы, якія пастаўлены ў прамове тав. Сталіна, патрабуюць ад рабкораў-металістаў і ад усяго заводзкага друку карэннага паляпшэньня і перабудовы работы, большай гібкасьці, апэрацыйнасьці і масавасьці. Канкрэтызацыя і сыстэматычнасьць кіраўніцтва партыйных і прафсаюзных арганізацый нізавым друкам і рабселькорамі, безадкладнае поўнае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і пастановы ЦК КП(б)Б аб друку і рабселькораўскім руху—забясьпечаць далейшы магутны ўздым рабселькораўскага руху, забясьпечаць стварэньне новай сеткі штодзённых насьценных газэт у кожным цэху, стварэньне насьценных газэт у брыгадах, агрэгатах, забясьпечаць узмацненьне існуючай сеткі нізавога друку. Усебеларускі зьезд рабселькораў з асаблівай сілай падкрэсьлівае, што ў забясьпячэньні сыстэматычнага і глыбокага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам—зарука далейшых, яшчэ больш магутных посьпехаў рабселькораўскага руху і яго ўздыму на новую, яшчэ больш высокую ступень. Вядучы самую бязьлітасную і пасьлядоўную барацьбу за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, шырока разгортваючы пралетарскую самакрытыку і змагаючыся за яе дзейснасьць, выкрываючы праяўленьні правай і «левай» апартуністычнай практыкі, рабкоры-металісты, разам з усёй масай рабселькораў, павінны па-сапраўднаму стаць у першых радох «у справе аўладаньня тэхнікай вытворчасьці, упарта змагаючыся за колькасныя і якасныя паказальнікі прамфінпляну, за ўмацаваньне гаспадарчага разрахунку і адзінаначальле, за далейшае разьвіцьцё сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў, рацыяналізацыю вытворчасьці, разьвіцьцё вынаходзтва і г. д.» (з пастановы ЦК УсеКП(б).

Рабкоры металяпрамысловасьці—адзін з перадавых атрадаў рабселькораўскай арміі—выконваюць пастаўленую перад рабселькорамі задачу—стаць пад кіраўніцтвам партыі «арганізатарамі мас для справы сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьня вытворчых плянаў і разгорнутага наступленьня на класавых ворагаў».

Кожны рабкор-металіст павінен быць ударнікам, кожны ўдарнік павінен быць рабкорам.

Настойліва і рашуча выкарчоўваючы рэшткі школьніцтва ў металяпрамысловасьці, у корані перасякаючы ўсе спробы клясавага ворага і яго агентуры затрымаць непераможнае будаўніцтва сацыялізму, — увесь фабрычна-заводзкі друк, уся маса рабкораў-металістаў, пад кіраўніцтвам партыі, высока трымаюць бальшавіцкі сьцяг барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, высока трымаюць бальшавіцкі сьцяг барацьбы за трэці рашаючы год пяцігодкі, за перамогу сацыялізму.

П. Броўка і А. Манькоў

Барацьба за паравоз

У старыя часы гэроў было лёгка распазнаць. Хадзілі яны ў сініх казённых распашанаць. Хадзілі яны ў сініх казённых майтках, у белых сьвітарах з Аленскай істужачкай у пятаніцы. Насілі вяскай істужачкай у пятаніцы. Насілі вялізныя шапкі з белымі або сінімі аколышамі. Былі і какарды, бясспрэчна. Праходзілі «верные стечеству граждане», абрузныя купцы, папы і чыноўнікі і гаварылі:

— Глядзеце, вось ідзе Пал Палыч, які гэрой, ён гэрой, 30 год у гарадзкой управе працуе.

Так паказвалі раней гэроў. І родныя ім па духу іх ведалі.

А ў нас гэроі, захаваўшыся па душных каморках цэхаў, скурчыўшыся ля топак, якія да сьнёкі ў горле дыхаюць у твар жарам, сагнуўшыся каля токарных варштатаў, каля фрэзераў, каля ліцейнай печы порхаюцца цэлую зьмену, напружваюць да таго мускулы, што ажно дранцьвеюць пальцы. І выгнуто ажно дранцьвеюць пальцы. І выгляду ў іх ніякага. Ну што гэта, скажуць, за гэрой, стаіць вось каля ліцейнай печы. Нават няжка распазнаць, што гэта за чалавек: увесь зашмальцаваны розным, у куртцы, якая што шротам прастрэлена ня кучы-мі іскрамі, а з твару плыпуць раўчакі перамешанага з сажай поту.

Доўгі час быў Шышкоў сьлесарам. Справа гэта мне кажа ён, вунь як знаёмая. Заплюшчыўшы вочы рабіць магу. Толькі і разлучаўся з работай, калі на фронты хадзіў.

— Паслалі, кажа, потым мяне на курсы мэханікаў. Ня спаў, а вучыўся. Хацелася ўсё ведаць, а час быў малы — усяго тры месяцы. Ну і скончыў, нават атэстат маю.

Цяпер Шышкоў загадчык мэханічнага цэху фабрыкі. Нядаўна ён высунут на гэту пасаду.

— Высунулі, дык вы думаеце я адарвуся ад рабочых, думаеце толькі тады я мог уносіць прапановы, а цяпер дык ужо і не. Жартуеце. Хоць і адміністратар я цяпер, а прапаноў у мяне многа.

І Шышкоў пачынае расказваць вялікую гісторыю з паравозам.

Фабрыка «Герой працы» нерайшла на мясцовы тарфяны апал. Перабудавана для гэтага новая сілавая станцыя і падважная дарога на 8 кілёмэтраў. Там ёсьць пагрузачная станцыя, якая павінна пушчаць на падважнай дарозе 350 ваганэтак торфу ў суткі, тады фабрыка будзе бесьперабойна працаваць. А з балота трэба везьці да пагрузачнай торф паравозам. Няма яго, або ён дрэнны і прастойвае доўга пагрузачная. Стаіць і фабрыка.

— Як пачуў я,—кажа Шышкоў,—што матавозы, заказаныя фабрыкай у Маскве, пайшлі на Магнасабуд і ня прыдуць да нас падвозіць торф, дык і задумаўся. Што-ж рабіць? Агледзеў на дварэ і дамаку-паравоз. Нікуды ня варты. У ім можа толькі вароны і начавалі. Паваў адміністрацыі адрамантаваць. Рабеце, кажу, пакуль на гэту пасьна, бо скора час і за торф брацца. Праўда, нажіраваліся паравоз у Гомель на рамонт, а прышоў ён адтуль яшчэ горш абшарпаным Пагубялі часткі, паракідаліся заклёнкі. Прывезьлі і паставілі на фабрычны двор, як марцьвяка.

Так нарадзілася ў Шышкова думка аб паравозе. Доўга хадзіў ён са сваёй прапановай па адміністрацыі, па галоўных мэханіках і тэхніках. Адны недаверліва касурыліся, другія ўсьміхаліся, безнадзейна раілі: рабі, рабі, а ў душы думалі: «носіцца, як дурань з пісанай горбай», а тэхнік **Сьцяпанчык** дык проста сказаў:

— Ня дуры ты галавы, Шышкоў, нічога з гэтага ня выйдзе...

У дырэкцыі таксама ківалі галовамі:

— Ня можна за гэта брацца.

І так усюды. Кінуўся да свайго галоўнага мэханіка **Забубёнага,** і той:

— Не выдумляй лепш ліпнята...

Нават калі ўжо дагадаўся з кацельшчыкамі і тыя згадзіліся зрабіць топку, Забубённы палохаў:

— Абавяжуць цябе рознымі тэрмінамі, будуць цягаць, ганяць, а выйдзе глупства...

Аднак, Шышкоў ня траціў надзеі. Да яго далучыліся яшчэ рабочыя і майстры. Так стварылася брыгада. Прыйшлі майстар **Саньнікаў** і **Барбарычэў,** стары ліцейшчык **Назараў** і **Рубрыкаў,** малодзьшчык **Шкуратаў, Буцькін,** токары **Жывапісцаў, Марозаў, Баранаў** і іншыя.

Брыгада сказала:

— Паравоз будзе! Зробім яго мы!

І так пачалося ўпартае, да дзесятага поту змаганьне за паравоз. Брыгадзкі працуюць на выходных днёх, працуюць звыш часу, пекаторыя па 20 гадзін у суткі. Рамантуюць, робяць новыя часткі, робяць нават самі інструмант, якім трэба рабіць часткі для паравоза.

Ніхто не хацеў пічыра дапамагчы гэтаму. Энтузіязм рабочых і не крапуў спакойных душ кіраўнікоў. Яны па-ранейшаму мала думалі пра паравоз.

Вось на якія перашкоды натыкаліся брыгадзкі:

— З будаўнічай канторы далі майстра **Барбарыча,** а падручнага не далі. І так цягнулі з 23 чэрвеня да 13 ліпеня. Барбарычу было цяжка і амаль немагчыма працаваць. Заводакіраўніцтва-ж глядзела скрозь пальцы. Калі зьвярнуліся ў партком, там паспачувалі, абяцалі дапамагчы і некалькі тыдняў нічога не зрабілі.

Патрэбны былі для паравоза трубы. Знайшлі трубы ў Гомелі. Прасілі **Жаўнова і Цэйга** з аддзелу забесьпячэньня прывезьці іх. Можна было прывезьці 20 чэрвеня, але яны так «шакланаціліся», што трубы ляжалі без усякага руху 10 дзён на пляцформе станцыі Гомель.

— Два тыдні прасілі заклёнак у аддзеле забесьпячэньня. Ці далі. Тады брыгадзір **Саньнікаў і Барбарыч** самі зрабілі заклёнкі ўручную.

Так сустракалі адну за другой перашкоды брыгадзкі. Самі шукалі матар'ялу, самі рабілі тыя часткі, якія трэба было заказваць і прасіць.

Мы прайшліся пагледзець на брыгадзкі. Выхадны Шышкоў вадзіў нас да іх. Кожны прагна стаіў над сваёй работай.

— **Марозаў** рабіў масьлёнкі, якія раней можна было атрымаць гатовымі. Токар **Баранаў** рабіў валы:

— Вось, кажа ён, па заданьні трэба вал рабіць 5 дзён, а я зраблю за два дні.

У ліцейнай стары **Назараў** сядзеў ля печы, увесь абкопчаны і потны. Ён ужо 32 гады на вытворчасьці. У ранейшыя гады любіў і падгульнуць. Часамі і прагул рабіў. А як стаў працаваць у брыгадзе, зусім не пазнаць чалавека. Ня выгнаць з майстэрні. Ужо некалькі раз прэміраваны. Калі Шышкоў спытаў, ці зробім паравоз—стары Назараў спакойна адказаў:

— За сябе ручаюся, на два дні раней зраблю.—І зноў пачаў увіхацца ля печы.

Так змагаюцца за паравоз. Брыгадзкі радуюцца сваёй рабоце і гавораць:

— Скора з гэтага мерцьвяка выйдзе гігант-паравоз, апраўдуты ў новую кашулю. Ён будзе на поўны ход цягаць торф да пагрузачнай. І ня будзе стаяць фабрыка.

А яшчэ жартавалі брыгадзкі:

— Той паравоз, які цяпер працуе на торфе, калека супроць нашага. Дыхаліны ён. А як возьмі яго на пагрузачную, дык палову фабрыкі і ўсю мэханічную зьбіралі — тысячы чалавек. Шуму і гаму было, не абярыся. Тры дні цягнулі. А мы свой паравозік нават нанава і ўсяго ў пяцёх заданнем на месяц.

— Бачыце, кажуць яны, вунь, у траве зарасьлі 4 лёкамабільныя калёсы. Мы з іх зробім сапраўдныя калёсы. Нашага маладога (так яны праклалі паравоз) паставім на гэтыя калёсы, падчэпім трактарам і за пяць гадзін ужо ён паблізьць на рэйках.

Так, можна паверыць ударнікам сацыялістычнай працы. Паравоз пацягне вагонэтак торфу па пагрузачную. Торф пойдзе нармальна па падважнай.

Будуць роўна, разьлічана плыць па тросах вагонэткі, поўныя торфу. Будзе бесьперабойна працаваць ф-ка «Герой працы».

Вось дзе яны нашы гэроі.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

УБОРКА ІЛЬНУ—

першачаргов

ПАЗЫКА „3-ці РАШАЮЧЫ“

АДНААСОБНЫ СЭКТАР—НА БУКСІР!

МАБІЛІЗАВАЦЬ ВЛСКО'ВУЮ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ НА РАШУЧАЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЕ КАМПАНІІ. ВЕСКА ПАВІННА ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН РЭАЛІЗАЦЫІ

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

аб ходзе рэалізацыі пазыкі „Трэці рашаючы“

НА 1 ЖНІЎНЯ 1931 г.

Паводле дадых Наркамфіну, на 1 жніўня па БССР рэалізавана пазыкі «Трэці рашаючы» на 32.017.000 руб., што складае 76 проц. АГУЛЬНАГА заданьня. Сярод рабочых і служачых рэалізавана 108,9 проц. заданьня, у КАЛГАСАХ — 92,4 проц., у АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ—3,9 проц.

З гэтага відаць, што самым адсталым участкам рэалізацыі пазыкі зьяўляецца аднаасобны сэктар. Асноўная прычына—невыстарчальная разгорнутая масава-растлумачальная работа раённых арганізацый, і ў першую чаргу фінорганаў, сярод аднаасобнікаў—беднякоў і серадняковаў.

Калгасы павінны ўзяць на буксір адстаючы адзіласобны сэктар, дапамагчы сельсаветам поўнасьцю рэалізаваць вызначаныя ім заданьні.

Раўняцца па перадавых сельсаветах

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ.

Калі заданьне па рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых на Буда-Кашалёўскім раёне значна перавыканана (148 проц.), дык па вясковым сэктары гэта справа адстае. На 20-та ліпеня на вёсны рэалізавана толькі 35,2 проц. заданьня.

Афармленьне падпіскі на калгасах праходзіць недапушчальна марудна. Райкалгасаюз і раённая камісія садзейнасьці дзяржкредыту і апчадкасправе ня прымае адпаведных мер для ўзмацненьня афармленьня падпіскі сярод калгаснікаў.

Рад сельсаветаў спачатку ўдарнай дэкады арганізавалі чырвоныя абозы па вывазцы лесу і за гэтыя тропы набылі аблігацыі. Рагінскі сельсавет арганізаваў тры нядзельнікі па вывазцы лесу і на зароблены 600 руб. набыў аблігацыі.

Раённая камісія садзейнасьці выдзеліла 500 руб. для проміваньня лепшых ударнікаў вясковых камісій садзейнасьці, якія выканалі заданьні на працягу ўдарнай дэкады.

Трэба яшчэ больш узмацніць работу па рэалізацыі пазыкі. Адстаючыя сельсаветы павінны раўняцца па перадавых і разгарнуць сапраўды баявы тэмп работы.

ШКАБАРЫН.

Не рэалізавалі ні аднэй аблігацыі

У Сеньненскім раёне рэалізацыя пазыкі праходзіць вельмі слаба. Аляксініцкі, Застацольскі, Латыгаўскі, Мачэнскі, Навасельскі, Пустынскі і Ульянаўскі сельсаветы літаральна бяздзейнічаюць. Да гэтага часу сельсаветы ня стукнулі пальцам аб палец для разгортваньня кампаніі. У выніку ўсе гэтыя сельсаветы на сёньняшні дзень не рэалізавалі ні аднэй аблігацыі.

Райвыканком павінен рашуча ўзьдзейнічаць на сельсаветы, прымусіць іх выканаць поўнасьцю свае заданьні.

Г.

ПАПЕРУ—КРАІНЕ

НА ДОБРУСКАЙ ФАБРЫЦЫ ЛІКВІДАВАНЫ...

КАНТРОЛЬ ЗА ПРЫХОДАМ НА РАБОТУ

ФАРСАВАЦЬ ТЭМПЫ БАРАЦЬБЫ ЗА 110 ТОН У ДЗЕНЬ

Цкавальнікаў рабкораў Цьвіра і Талкачова да суровай адказнасьці

НЯ ЗЬНІЖАЦЬ ТЭМПАЎ!

ДОБРУШ. (Тэлеграфна ад выязной брыгады „Зьвязды“). У сувязі з лепшай падачай торфу з пагрузачнай, штодзённае выкананьне заданьняў фабрыкай „Гэрой працы павялічваецца. Так, 30 ліпеня дана 69 тон паперы, 31 ліпеня—62 тоны, 1 жніўня—76 тон.

УСТАНАВІЦЬ ДАКЛАДНЫ УЛІК ПРЫХОДУ НА РАБОТУ

Неадкладна выканаць загад дырэктара т. Юшкова

На фабрыцы «Гэрой працы» дэкаднага ўліку прыходу і адыходу з работы не вядзецца. Цэнтральнай табэльнай няма. Гаспадарнікі лічаць, што з пераходам на гаспадарчы разрахунак нагляд за свячасовым прыходам і адыходам з работы не абавязковы. У выніку гэтага нельга ўстанавіць % спазьненьняў на работу. Па цэхах улік прыходу на работу вядуць табэльшчыкі, але вядуць гэта такім чынам, што фактычна спазьненьні не запісваюцца, бо абыходзяць сталы і машыны для адзінкі яўкі значна пазьней устаноўленага часу прыходу на работу. Вядуць, праўда, улік і пазьменныя майстры, але і яны вядуць гэта недакладна. У выніку ёсьць выпадкі, калі па некалькі дзён рабочыя ня прыходзяць на работу і нідзе гэтага ня відаць. Так, у СЦЗ рабочы ХІМЧАНКА не зьявіўся на работу 22 ліпеня, а ў табэлі было адзначана, што ён гэты дзень працаваў. Такія факты бываюць і ў другіх аддзелах. Міліцыянары, якія стаяць каля праходнай канторкі, ня сочас за свячасовым прыходам на работу і прапускаюць і тых, якія спазьняюцца, выпускаюцца таксама без прапускоў праз будку раней зьмены.

Новы дырэктар тав. ЮШКОЎ даў загад аддзелу эканомікі ў 3-хдзённы тэрмін працы ўстаневіць нумарацыю і цэнтральную праходную, але гэты загад ня выканан.

Брыгада «Зьвязды»: Будзінскі, Броўка, Манькоў.

„МЫ З ТАБОЙ ПАКОНЧЫМ...“

На фабрыцы „Гэрой працы“ агенты клясавага ворага беспакарана цкавалі рабкораў Цьвіра і Талкачова

Бяз усякай літасьці пакараць арганізатараў цкаваньня

«Зьвязда» ўжо паведамляла аб абурэючым фанце збойства рабкора ЦЬВІРА на фабрыцы «Гэрой працы».

Рабкор ЦЬВІР з першага дня работы на фабрыцы пачаў барацьбу праз шматтыражку «Чырвоная бракамолка» з тымі агідна́сьцямі, якія мелі месца ў электраадзеле. Майстар аддзелу ПРАНУ-траддзелу. Майстар аддзелу Пранузенка Ф. завёўшы цёплую сямейку п'яніц, рвачоў і прагульшчыкаў, больш клапаціўся аб выпіўцы, чым аб вытворчасьці. У гэту сямейку трапіў і старшыня цэхкому КАЛЕСЬНІКАЎ. Пранузенка і Калесьнікаў, што хацелі тое і рабілі. Прымалі на работу каго жадалі, прызначалі разрады, якія ім уздумаецца і г. д. Такім чынам была прынята і дачка ПРАНУЗЕНКА, якой адразу вызначылі 6-ы разрад.

Рабкор ЦЬВІР і ўступіў ў барацьбу з гэтай сямейкай, выкрываючы ўсе агідна́сьці. Гэта не спадабалася заг. аддзелам ПРАНУЗЕНКУ і яго кампаніі. Калі Цьвір уносіў якія-небудзь прапановы, Пранузенка адказваў: «ЯКАЯ ВАМ СПРАВА, Я САМ БОЛЬШ ВЕДАЮ». Цьвір аб усіх такіх выпадках пісаў у шматтыражку. Пранузенка пачаў шукаць выпадкі адпомсьціцца Цьвіру за яго крытыку.

Хутка такі выпадак здарыўся. У часе дзяжурства Цьвіра хтосьці з кампаніі Пранузенкі выключыў 6-ю машыну. Калі Цьвір прышоў да Пранузенкі і сказаў, што наспраўды аэрастат, Пранузенка закрычаў: «АГА, ВОСЬ КААЛІ МЫ З ТАБОЙ ПАКОНЧЫМ».

У сувязі з гэтым Цьвір быў звольнен.

Старшыня цэхкому Калесьнікаў санкцыянаваў гэта звальненьне.

Тры месяцы справа рабкора хадзіла па інстанцыях. Урэшце інспэкцыя працы аднавіла Цьвіра на рабоце і ўстанавіла ганеньне на яго, як на рабкора. Пленум фабкому пастанавіў зьняць з працы Калесьнікава і Пранузенку.

Аднак, пасьля прыходу на работу, Цьвіра зноў сустрэлі ў штыхі. У першы-ж дзень прыходу яго на работу мэханік ЗАБУБЁННЫ прапанаваў прыйсьці яму заўтра. На другі дзень Забубённы нядвузначна папярэдзіў: «МЫ ВАС ПРЫМАЕМ НА РАБОТУ, АЛЕ ТРЫМАЙЦЕ ЯЗЫК ЗА ЗУБАМІ». На гэта ніяк не рэагавалі. Сямейка Калесьнікава шыпела: «мы-цябе ўбярэм», «не дамо табе тут жыць» і г. д.

10 ліпеня адбылася разьвязка. Калі Цьвір зайшоў у электраадзел, субутэль ік Калесьнікава ПЕСЕНКА крыкнуў: «Вон адсюль» і накінуўся на яго з бутэлькай і кулакамі. Збіваючы Цьвіра, Песенка крычаў: «Я табе пакажу пісаць заметкі».

Зараз усе бінзаетыя ў цкаваньні рабкора Цьвіра АРЫШТАВАНЫ.

Неабходна адзначыць, што старое кіраўніцтва фабрычных арганізацый праяўляла правапартыністычнае ігнараваньне рабселькораўскага руху і тармазіла самакрытыку. Толькі гэтым можна вытлумачыць палітычную блізарукасьць і апартуністычныя адносіны фабрычнага кіраўніцтва і самай рэдкалегіі «Чырвонай бракамолкі» да справы рабкора Цьвіра. Толькі гэтым можна вытлумачыць і той факт, што і ў стагярным цэху меў месца другі факт цкаваньня рабкора ТАЛКАЧОВА. Калі апошні пачаў выкрываць злачынствы майстра КАЦЭВІКАВА і старшыні цэхкому КАЛЕСЬНІКАВА, Талкачова звольнілі з работы.

Фабрычнае кіраўніцтва не абараніла рабкора. Рэдкалегія, у складзе якое, між іншым, быў сын самога КАЦЭВІКАВА, які выдаваў аўтара допісаў праз свайго бацьку і яго кампанію,—таксама ніяк не рэагавала на гэтыя абурэючыя факты.

На фактах ганеньня рабкораў Цьвіра і Талкачова неабходна мабілізаваць увагу ўсёй рабочай грамадзкасьці фабрыкі. Неабходна разгарнуць шырокую кампанію па перабудове рабкораўскай работы, па ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва рабкораўскім рухам. Вінаватыя ў збойстве і цкаваньні рабкораў павінны панесьці самую суровую кару.

Выязная брыгада «Зьвязды»:
А. МАНЬКОЎ, П. БРОЎКА.

БАБРУЙСКІ КАМБІНАТ

БАБРУЙСКІ РК І РАЙПРАФСАВЕТ ПАВЯРНУЛІСЯ СЬПІНОЮ да камбінату

Бабруйскія раённыя арганізацыі ніякай канкрэтнай дапамогі дрэваапрацоўчаму камбінату ў барацьбе з прарывам не аказваюць. За ўвесь час знаходжаньня брыгады «Зьвязды» прадстаўнікі райкому КП(б)Б і райпрафсавету прыбылі на камбінат толькі тады, калі здарылася аварыя. Апрача гэтага ні РК, ні РПС не прысылалі сваіх прадстаўнікоў для практычнай дапамогі камбінату ў ліквідацыі прарыву. Нават прымацаваны бюро РК КП(б)Б старшыня райпрафсавету тав. ГЕРАФКЕР ні разу на камбінат не зьяўляўся. У выніку прафработа на камбінаце не перабудавана.

Ня гледзячы на неаднаразовыя спробы брыгады «Зьвязды» прыцягнуць да непасрэднай работы на камбінаце прадстаўнікоў РК, гэтага не ўдавалася дабіцца. Апрача пастаноў РК ніякай дапамогі не аказваў.

Некалькі дзён таму назад на камбінат прыяжджалі члены бюро ЦК КП(б)Б т.т. ГАНТМАН і ЧАРНУШЭВІЧ. На сыліконай нарадзе быў выпрацаван рад мерапрыемстваў, якія павінны забясьпечыць ліквідацыю прарываў. Райпрафсавету дана заданьне да 29 ліпеня забясьпечыць камбінат 80 кваліфікаванымі рабочымі. Гэта заданьне да сёньняшняга дня ня выканана. 31 ліпеня зьявілася толькі 20 чалавек. Гарсавет павінен быў забясьпечыць рэгулярны рух аўтабусаў. Замест гэтага з 28 ліпеня аўтабусы зусім кінулі хадзіць. У выніку за гэтыя дні павялічыліся прагулы на 100 процантаў. Такім чынам рад пастаноў, якія прыняты на апошняй нарадзе, не ажыцьцяўляюцца. Наўрад ці забясьпечаць ліквідацыю прарыву такія тэмпы работы Бабруйскага РК і РПС.

Н. НЭЙДЛІН.

Турбінная сапя Белдрэсу

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку“

Магілеўскія загатоўчыя арганізацыі

НЕ ГАТОВЫ ДА ПРЫЁМУ УРАДЖАЮ

Гомельскі элеватар пусьціць тэрмін

У Гомелі будуецца буйнейшы элеватар, які мае вялізарнае значэньне для буйной гаспадаркі БССР. Элеватар разьлічан на мільённыя абароты збожжа, якое будзе прымацца з чыгункі і з порту. Элеватар будуецца паводле апошняга слова тэхнікі.

У асноўным пабудова элеватара павінна быць скончана да 20 верасьня гэтага году, а склад—да 20 жніўня. Матар'яламі мясцовага значэньня (граві, пясок, камень) будаўніцтва элеватара забясьпечана.

Аднак, рад арганізацый ня выконваюць нарадаў.

Беларускае аддзяленьне «СТАЛЬЗБЫТ» не даставіла дробна-гатункованага жалеза, неабходнага для арматуры. Гэта жалеза было каліравана з Дняпра-Бугскім водным транспартам. «Сталь-збыт» ня ўлічыў, што ў чэрвені можа спыніцца меліаводзьдзе і жалеза можа затрымацца. У выніку да гэтага часу жалеза яшчэ ня прыбыла ў Гомель і невядома нават, дзе яно знаходзіцца.

Ёллікім тормазам у рабоце зьяўляецца НЕДАХВАТ РАБОЧАЙ СІЛЫ, асабліва чорнарабочых. Ня гледзячы на рад пастаноў вышэйшых партыйных і савецкіх органаў, забясьпячэньне будаўніцтва рабсілай пастаўлена надзвычай дрэнна. На 26 ліпеня на пабудове працавала усяго 515 чалавек. Між тым, неабходна для НАРМАЛЬНАГА ВЯДЗЕНЬНЯ І СВАЯЧАСОВАГА СКАНЧЭНЬНЯ БУДАЎНІЦТВА ня менш 1.000 РАБОЧЫХ.

Будаўніцтва зусім не забясьпечана водаправоднымі чыгуннымі трубамі. «Сакостоль» быў у свой час дан наряд на 30 тон труб. Аднак, да гэтага часу адгружана толькі 9 тон. На рэшту-ж труб наряд чамусьці ануляваны. Такія адносіны да забясьпячэньня будаўніцтва элеватара неабходнымі матар'ялямі зусім недапушчальныя.

Кіраўніцтва пабудовы элеватара ня дасьць рашучэ і энэргічна змагацца за выкананьне вызначаных тэрмінаў. Яно невыстарчальна праводзіць у жыцьцё неабходныя мерапрыемствы. Так, МЯСЦОВЫЯ МАТАР'ЯЛЫ (граві, камень), якія магілі быць загатоўлены свячасова, фактычна ЗАГАТОЎЛЕНЫ СА ЗНАЧНЫМ СПАЗЬНЕНЬНЕМ. Ня прынятыя меры да вярбоўкі рабочай сілы. Кіраўніцтва пабудовы чакае, пакуль рабочую сілу прышлюць з аддзелу кадраў замест таго, каб патрабаваць ад вышэйшых органаў прымацаваньня адпаведных раённаў і павесьці там належную работу па вярбоўцы рабочай сілы.

Трэба ліквідаваць прарывы ў ходзе будаўніцтва гомельскага элеватара. Каб прысьпяшыць пабудову сіласнага корпусу і вежы, неабходна зараз-жа перавесьці работу на 2 зьмены. У гэтым выпадку будаўніцтва корпусу і вежы можа быць скончана да 20 верасьня. На гэту работу патрэбна ня менш 300 чалавек.

Трэба шырока разгарнуць сацыялістычныя мэтады працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва — на будаўніцтве. Усякія разважаньні аб тым, што ў зьмену нельга забэтанаваць больш мэтра ў вышыню, ня маюць грунту і павінны быць спынены. Практыка паказала, што бэтонныя работы можна весьці значна больш хуткімі тэмпамі. Трэба арганізаваць сацспаборніцтва паміж зьменамі і пасобнымі групамі рабочых. Да гэтага часу бэтонамешалка давала 250 замесаў у зьмену, трэба дабіцца, каб яна давала ня менш 400 замесаў (практыка работы на пабудове іншых элеватараў у СССР).

Пабудова элеватара павінна быць скончана ва што-б там ні было ў тэрмін. Для гэтага трэба прыняць усе меры па забясьпячэньні будаўніцтва неабходнымі матар'ялямі і рабочай сілай.

П. КАЛАМІЕЦ.

Калгасьнікі накіроўваюць збожжа на прыёмачныя пункты.

„РАБОТА НЕВЯЛІКАЯ — ПАСЬПЕЕМ“

МАГІЛЕЎ. Наш кар.).

Падрыхтоўка да збожжазагатовак у Магілеўскім раёне праходзіць нездавальняюча. Ні адна з загатоўчых арганізацый ня ўключылася ў рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б).

Райгандаль да гэтага часу яшчэ ня даў указаньняў мясцом аб разгортваньні масава-растлумачальнай работы сярод калгаснікаў, беднякоў і серадняковаў. Што робіцца на мясцох — райгандаль ня ведае. Райвыканком таксама мала цікавіцца збожжазагатоўкамі.

Склады райгандлю і аддзяленьня Саюзхлеба не падрыхтаваны да прыёму збожжа. Саюзхлеб аклаадзае падрыхтоўку да збожжазагатовак з дня на дзень, лічачы, што «работа не вялікая — пасьпеем».

Тары ёсьць толькі 30 проц. патрэбнай колькасьці. Саюзхлеб ня прымае ніякіх мер да мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў тары і спагнаньня запазычанасьці з устаноў. На сёньняшні дзень за рознымі арганізацыямі лічыцца 58.560 мяшкоў.

Райсаўкаапсаюз нічога ня робіць для свячасовага запаўненьня кантрактацыйных кніжак. Замест патрэбных 10.000 кніжак да гэтага часу запоўнена толькі 1.500 і тыя ня поўнасьцю (не паказана, колькі і чаго кантрактант павінен здаць).

Райкалгасаюз і райспажыўсаюз—у баку ад збожжазагатовак. Ніякіх вестак аб падрыхтоўцы да кампаніі на сыстэмах гэтых арганізацый няма.

У пятнаццацідзённік агляду ні адна раённая арганізацыя дагэтуль фактычна яшчэ ня ўключылася.

Кіруючыя раённыя арганізацыі павінны неадкладна забясьпечыць рашучы пералом у падрыхтоўцы да збожжазагатоўчай кампаніі.

С.

Агляд перабудовы каапэрацыі працягваецца

Арганізацыя лесарабкопаў на тармазох

У ТУРАЎСКІМ ПЯТРЫКОЎСКІМ, БАГУШЭЎСКІМ, МАЗЫРСКІМ І БЯРЭЗІНСКІМ РАЁНАХ РАЗБАЗАРВАЮЦЦА ПРАМТАВАРНЫЯ І ПРАДУКТОВЫЯ ФОНДЫ

Зрабіць круты пералом у забясьпячэньні плытагонаў і лесарубаў

Усебеларускі зьезд лясной каапэрацыі, які 2 жніўня распачаў сваю работу, павінен вырашыць рад важнейшых задач.

Цяпер, калі ўвага партыі і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці сканцэнтравана на пытаньні хутчэйшай ліквідацыі прарыву ў лесазагатоўках і сплаве, зьезд павінен завастрыць увагу на тым, каб лесарабкопы сапраўды ператварыліся ў падсобныя цэхі забясьпячэньня лесапрамгасаў і сплаўных пунктаў.

Трэба канстатаваць, што да гэтага часу перабудова работы каапэрацыі праходзіць чарапашчымі тэмпамі. Баявая дырэктыва партыі і ўраду аб паляпшэньні забясьпячэньня лесарубаў і плытагонаў, аб пераважным забясьпячэньні ўдарнікаў, ня выконваецца. Ёсьць рад фактаў, калі важнейшыя вытворчыя вучасткі застаюцца без прамтавараў і прадуктаў. У радзе раёнаў ёсьць выпадкі злачыннага разбазарваньня прамтаварных і прадуктовых фондаў, якія вызначаны для лесазагатовак і сплаву.

Райсаюзы затрымліваюць перадачу лесарабкопам паявых капіталаў і фондаў. У Асіпавічах райсаюз зьняў з забясьпячэньня лесарубаў да прымацаваньня іх да лесарабкопу. У Барысаве лесарабкоп арганізаваўся яшчэ месяц таму назад, але да гэтага часу не атрымаў ад райсаюзу фондаў мануфактуры на 2800 руб., махоркі і г. д.

Партыйныя і прафсэкцыянальныя арганізацыі на мясцох таксама не аказваюць належнай дапамогі па ўкамплектаваньні работнікамі і наогул у разгортваньні работы лясной каапэрацыі.

Лясная каапэрацыя—арганізацыя маладая. Трэба ёй аказаць максымальную дапамогу ў наладжаньні забясьпячэньня лесарубаў і плытагонаў. Лесарабкопы павінны на-хаду выправіць свае недахопы і сапраўды павярнуцца тварам да лесапрамгасаў і сплаўных пунктаў.

Лясной сэкцыі Белкаапсаюзу трэба адмовіцца ад кіраўніцтва цыркулярамі, а замест гэтага аказваць лесарабкопам практычную дапамогу ў іх штодзённай рабоце.

За месяц амаль ніякага зруху

БАРЫСАЎ. Лесарабкоп існуе ўжо каля месяца, але праца яго не прыстасавана яшчэ да патрабаваньняў лясных рабочых.

Дагэтуль лесарабкоп не атрымаў ад райсаюзу фондаў па лесазагатоўках—мануфактуры на 1.800 руб., трыкатажу—на 1.000 руб., 38 скрынак махоркі, 6 тон цукру. Белкаапсаюз прыслаў дзьве бочкі з рыбай, з якіх адну прышлося выкінуць, бо рыба аказалася гнілой.

Не аддаецца ўвагі мабілізацыі сродкаў, да ўліку пайшчыкаў не прыступілі, гаспадарчы разрахунак не ўкараняецца. Работа праходзіць самацёкам. Дагавары на пастаўку тавараў ні з кім не заключаны.

Завод «Полымя Рэвалюцыі». На здымку: ударніі тав. Шарпко" максымум прыкладае энэргіі да ліквідацыі абязьлічкі, прыкладны гаспадарнік.

ГОМРАЙСАЮЗ НЕ ЖАДАЕ ДАПАМАГАЦЬ ЛЕСАРАБКОПАМ

ГОМЕЛЬ. Гомрайсаюз не перадаў лясной каапэрацыі прадуктовых і прамтаварных фондаў. Ня скончана перадача паявых капіталаў.

Гандлёвая сетка лесарабкопаў не разгортваецца. Крамы лесарабкопаў у Гомелі, Нова-Беліцы і ў іншых мясцох лесасплаву і лесазагатовак ня маюць абсталяваньня. У Гомелі праўленьне лесарабкопу адрамантавала пустуючае памяшканьне пад базу. Але Белпайгандаль адабраў яго. У Нова-Беліцы крама спажыўтаварыства на 90 проц. абслугоўвае лесазагатоўкі. Гэта крама таксама ўпарта не перадаецца лясной каапэрацыі.

Лесапрамгасы це аказваюць дапамогі. Лесасэкцыя Белкаапсаюзу не наладзіла плянавага забясьпячэньня лясной каапэрацыі.

А. Деманаў.

Зьезд лясной каапэрацыі

Фонды для лесарубаў і плытагонаў разбазарваюцца

2 жніўня ў МЕНСКУ адкрыўся ўсебеларускі зьезд лясной каапэрацыі. Першы дзень быў прысьвечан дакладу аб задачах лясной каапэрацыі БССР у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

У спрэчках дэлегаты з месц паказвалі на рад прарываў у рабоце лесарабкопаў. Многія райсаюзы ня толькі не аказваюць ім дапамогі, але перашкаджаюць разгортваньню работы лясной каапэрацыі. Яшчэ да гэтага часу не скончана перадача паявых капіталаў і прадуктовых і прамтаварных фондаў. Замест гэтага ў ТУРАЎСКІМ, ПЯТРЫКОЎСКІМ, МАЗЫРСКІМ і БЯРЭЗІНСКІМ раёнах ёсьць шматлікія факты злачыннага разбазарваньня гэтых фондаў. У БАГУШЭЎСКІМ раёне мыла, якое было атрымана для лесарубаў, раздана служачым раённага апарату. Рыба і алей былі перададзены тым калгасам і грамадзкім сталоўкам, у якіх лесарубы не сталуюцца. Авёс, прызначаны для лесавывазкі, перададзены сьвінаадкормачным пунктам і для разьязных коняй райсаюзу. У часе месячніка лесазагатовак была прыслана для лесарубаў махорка, але яе раздалі па запісках розным работнікам.

Лесарабкопам не перадана каля 100 крам. Не перадаюцца нават тыя крамы, якія абслугоўваюць у значнай частцы лесараспрацоўні.

Кіраўніцтва з боку лясной сэкцыі і Белкаапсаюзу невыстарчальнае. Дэлегаты ў сваіх выступленьнях патрабавалі ўзмацненьня кіраўніцтва лесарабкопамі.

Посьпехі Клімавіцкага раёну

КЛІМАВІЦКІ РАЁН ПЕРАВЫКАНАЎ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ «ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ». СЯРОД РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ РЭАЛІЗАВАНА 132 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ, НА ВЁСЦЫ — 129,5 ПРОЦ.

У СЯРЭДНІМ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН РЭАЛІЗАЦЫІ ПА РАЁНЕ ВЫКАНАН НА 102,3 ПРОЦ. ПЕРШАПАЧАТКОВАЯ КАНТРОЛЬНАЯ ЛІЧБА ВЫКАНАНА НА 130,5 ПРОЦ. ПАДПІСКА ПРАЦЯГВАЕЦЦА.

УСІМ САКРАТАРОМ ГАРКОМАЎ І РАЙКОМАЎ КП(б)Б

КАТЭГАРЫЧНА ПРАПАНУЕЦЦА ПРЫСЛАЦЬ НЕ ПАЗЬНЕЙ ДЗЕСЯТАГА ЖНІЎНЯ ЎСЕ МАТАР'ЯЛЫ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ МЕСЯЧНІКА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ.

ЗА САКРАТАРА ЦК КП(б)Б
ГАНТМАН.

А. ХАЦКЕВІЧ

Выкананьне фінплян у БССР за першае паўгодзьдзе

Сьнежаньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) падкрэсьліў, што «пасьпяховае выкананьне фінансавага пляну і бюджэту знаходзіцца ў простай залежнасьці ад выкананьня якасных і колькасных паказальнікаў па ўсіх галінах гаспадаркі». Вынікі 1-га паўгодзьдзя з поўнай выразнасьцю пацьвярджаюць узаемазалежнасьць фінансавага і агульна-гаспадарчага плянаў.

У параўнаньні з 1-м паўгодзьдзем 1930 г. народная гаспадарка БССР паказвае значныя дасягненьні. Валавая прадукцыя прамысловасьці ВСНГ павялічылася на 42,7 проц., прадпрыемствы НКСнабу павялічылі сваю прадукцыю на 33,7 проц., калектывізацыя сельскай гаспадаркі дасягнула на 1-VII 40,1 проц. замест заданьня ў 30 проц. (зараз процант калёктывізацыі ўжо перавышае 42 проц.).

Ня гледзячы на гэтыя дасягненьні, вынікі выкананьня колькасных і асабліва якасных паказальнікаў у 1-м паўгодзьдзі 1931 г. трэба прызнаць нездавальняючымі. Прамысловасьць яшчэ не перабудавала сваёй працы ў адпаведнасьці з задачамі, пастаўленымі народна-гаспадарчым плянам на рашаючы год пяцігодкі. Прамысловасьць ВСНГ на працягу 1-га паўгодзьдзя не дадала прадукцыі на 25 мільёнаў руб., або на 15,8 проц. пляну; па прамысловасьці НКСнабу недабор валавой прадукцыі вызначаецца ў 8 мільёнаў (25,8 проц. пляну), плян таваразвароту выкананы толькі на 88,7 проц. Яшчэ горшая справа з якаснымі паказальнікамі. Выкананьне пляну зьніжэньня сабекошту — асноўнай крыніцы ўнутры-прамысловага накапленьня — застаецца найбольш адсталым вучасткам. Пры гадавым заданьні па зьніжэньні сабекошту па прамысловасьці ВСНГ на 8,1 проц., за першыя пяць месяцаў дасягнута зусім мізэрнае зьніжэньне ў 0,4 проц.; прамысловасьць-жа НКСнабу паказвае нават павышэньне сабекошту (за 4 м-цы — на 4,7 проц.), невыкананьне пляну выпуску прадукцыі і зьніжэньня сабекошту прывялі да прарыву ў плянае накапленьняў прамысловасьці (ВСНГ і НКСнабу) прыблізна на 7,5—8 млн. рэ.

Асноўная прычына недавыкананьня прамысловасьцю сваіх заданьняў—**унутрывытворчыя недахопы працы.** Яркім прыкладам гэтага зьяўляецца завод Гомсельмаш. На красавік-май гэты завод быў забясьпечан сырцом на 100 проц., а плян у маі м-цы выканан толькі на 51,7 проц. Толькі ў апошнія дні Гомсельмаш дабіўся відавочнага пералому.

Шкэйная фабрыка «Прафінтэрн», якая у першым квартале мела на 18,7 проц. працаўных вышэй пляну, усё-ж выканала квартальныя заданьні толькі на 88,4 проц.

Пасобныя заводы і прадпрыемствы паказваюць сапраўды бальшавіцкую настойлівасьць і выкананьні прамфінпляну. Ня гледзячы на труднасьці з забясьпячэньнем сырцом, **завод «Бальшэвік»** дабіўся ў 1-м паўгодзьдзі выкананьня заданьня па выпуску прадукцыі на 105,5 проц., павышэньня прадукцыйнасьці праці на 104 проц. супроць пляну, зьніжэньня сабекошту на 6,2 проц. пры заданьні ў 4,2 проц.

Рэарганізаваная **спажывецкая каапэрацыя** яшчэ ня здолела наладзіць арганізацыйна-гаспадарчага кіраўніцтва сваёй сыстэмай. У выніку недаацэнкі сыстэмай спажывецкай каапэрацыі гаспадарча-палітычнага значэньня выкананьня фінпляну, неадпаведнай арганізацыі таваразвароту, плян паянакапленьня ў 1-м паўгодзьдзі выкананы толькі на 58,7 проц. На працягу 1-га паўгодзьдзя спажывецкая каапэрацыя не правяла належнай гібкасьці ў прасоўваньні тавараў да пакупца; райсаюзы і ЦРК не правялі ініцыятывы ў скарыстаньні мясцовых магчымасьцяй, у падшуканьні тавараў мясцовай і самастружнай прамысловасьці.

Напрыклад, для Рэчыцкага райсаюзу ліміт запасаў тавараў выначан у 120 тыс. руб. Фактычна на 1-VI у яго быў тавар на 330.000 руб. Што гэта за тавары? Парфюмэрыі на 14.000 руб., галянтэрэі на 28.000 руб., галянтэрэі на 40.000 руб., абутку на 7.000 руб. У Рэчыцы встача тавараў на 1-га ла ліміт, аднак, ім ня былі прыняты меры ні для продажу, ні для перакідкі ў іншы раён такіх значных рэштак. У той-жа час Халопеніцкі, напрыклад, раён застаўся амаль зусім без тавараў.

Пастанова ўраду аб напраўках да крэдытнай рэформы і новыя формы крэдытаваньня спрыялі ўкараненьню гаспадарчага разрахунку і ўзладараньню ўсёй крэдытнай сыстэмы. З асаблівай выразнасьцю дадатняя момэнты новага мэтаду крэдытаваньня адбіліся на рабоце **Белсельпрамбанка ня**ня. Фінансавыя труднасьці пасобных прадпрыемстваў прымусілі аб'яднаньне і прадпрыемствы пераследзець свае матар'яльныя стачы (былі праданы лішкі цукру і какава-парашку больш чым на 300 тыс. руб.).

Аднак, наогул гаспадарчы разрахунак і кантроль рублём не знайшлі яшчэ належнага глыбокага адбітку ў дзейнасьці гаспадарчых арганізацый на працягу першага паўгодзьдзя.

Гаспадарчыя арганізацыі і раённыя фінансавыя органы не ўстанавілі штодзённага дзейнага нагляду за выкананьнем фінпляну. Становішча справаздачнасьці, улік асноўных элемэнтаў фінпляну пасьпяўляе мачымасьці свячасова рэагаваць на ход выкананьня фінансавага пляну.

Важнейшая задача, якая стаяла ў першым паўгодзьдзі—**прыцягнуць вольныя сродкі насельніцтва праз добраахвотныя пазыкі** на мэты сацыялістычнага будаўніцтва — выканана са значным недаборам.

Плян мабілізацыі сродкаў за першы квартал ажыцьцёўлен на 76,6%, плян другога кварталу — толькі на 71,4 проц. За першае паўгодзьдзе сабрана добраахвотных плацяжоў у гарадох 77,2 проц. пляну, а на вёсцы — толькі 50,4 проц.

Асноўныя недахопы ў рабоце па мабілізацыі сродкаў, якія адбіліся на выкананьні фінпляну, — гэта **не кампанейскі характэр, слабая пастаноўка арганізацыйна-масавай работы,** няўменьне ўвязаць фінработу з чарговымі кампаніямі на вёсцы, патураючыя адносіны да кулацтва ў радзе раёнаў і, нарэшце, апартуністычная недаацэнка фінпляну.

Некаторыя раёны сыстэматычна праваляваюць пляны мабілізацыі сродкаў. Рэалізацыя пазыкі «Трэці рашаючы» ў радзе месц асабліва сярод аднаасобнікаў, ідзе павольнымі нездавальняючымі тэмпамі.

Зусім правільна зрабіў Наркамфін, калі ўдарыў рублём па адсталых раёнах, якім да пералому ў рабоце спынена высылка датацыі на мясцовым бюджэце. Кантроль рублём павінен навучыць іх мабілізаваць масы вакол фінпляну, захоўваць суровую фінансавую дысцыпліну, выконваць дырэктывы партыі і ўраду па мабілізацыі сродкаў.

Недапушчальна марудна праходзіць стварэньне моцнага фінансавага актыву на мабілізацыі сродкаў, у першую чаргу па вёсцы. Зусім недапушчальным зьяўляецца павялічэньне адміністрацыйных выдаткаў па некаторых цэнтральных установах, якое мела месца ў апошні час.

Неабходна яшчэ раз падкрэсьліць, што фінплян зусім рэальны. Гэта відавочна паказвае вопыт перадавых раёнаў, якія здолелі выканаць заданьні па мабілізацыі сродкаў і рэалізацыі пазыкі. Шляхам разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы, **Койданзўскі** раён пасьпеў поўнасьцю выканаць плян пад пёскі на пазыку «3-ці рашаючы» на вёсцы (101,7 проц.). Ударную бальшавіцкую работу паказаў **Клімавіцкі** раён. Работнікі **СІРОЦІНСКАГА** райфа з посьпехам правялі ўсю падрыхтоўку да спагнаньня сельгаспадатку і узялі на буксір суседні Вульскі раён. Брыгада работнікаў Сіроцінскага райфа на працягу 8 дзён ліквідавала прарыў у Вульскім раёне.

Плян мабілізацыі сродкаў за ліпень выканан Сіроцінскім раёнам на працягу 2-х дэкад на 100 проц. **Любаньскі** раён выканаў месячнае заданьне за ліпень на 180 проц.

Практыка гэтых раёнаў сьведчыць, што фінплян можа быць ажыцьц

Год выданьня—XV
№ 203 (4114)
АЎТОРАК, 4 ЖНІЎНЯ 1931 г.
Цана нумара 5 кап.
ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 43. Тэлефоны: рэдактар—4-27,)—сакратар—10-74, партсэктар—13-80, прамысл.—13-80, сац. земл.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, навны рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторавы ліч—7-81, адказ. абанемент—7-91

1-га жніўня за мяжою

Крывавым цэргібэлям НЯ СПЫНІЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ПАТОКУ

Пралетары фашысцкай Польшчы гатовы абараняць сацыялістычную бацькаўшчыну

ВАРШАВА, 3. Ня гледзячы на вострую падрыхтоўку паліцыі, у **Стшэмешыцах адбылася бурная дэманстрацыя.** Пасьля мітынгу, на якім выступалі некалькі прамоўцаў, якія заклікалі прысутных **да абароны СССР,** вялізарны натоўп дэманстрантаў накіраваўся да будынку гміннага праўленьня. Патруль паліцыі, якога дэманстрацыя сустрэла па дарозе, **пітаральна быў закідан каменьнямі, у выніку некалькі паліцэйскіх былі паранены.** У будынку гміны дэманстранты **выбілі ўсе вокны. Прыбыўшая паліцыя адкрыла агонь па дэманстрантах. Паранена некалькі асоб.**

Вялізарная дэманстрацыя адбылася ў **Сульно.** Паліцыю, якая імкнулася сарваць мітынг, абураныя рабочыя **зьбілі каламі і каменьнямі.** Пасьля гэтага дэманстранты праводзілі далей мітынг. Паліцэйшчына, атрымаўшы падмацаваньне, са зьверскай жорсткасьцю кінулася на рабочых і толькі пасьля **доўгай страляніны** паліцыі ўдалося разагнаць дэманстрантаў. **Паранена некалькі асоб.**

У **Лодзі,** а таксама па ўсіх амаль гарадох Лодзінскай акругі **адбыліся шматлюдныя рабочыя дэманстрацыі.** У самой Лодзі **кампартыя правяла некалькі вялікіх масовак; пашырана была значная колькасьць першажнівеньскіх адозваў і вывешана шмат транспарантаў з камуністычнымі пёзунгамі.** У часе выступленьняў арыштавана некалькі рабочых.

У **Вільні** адбылося некалькі масовак, на якіх выступаўшыя прамоўцы падкрэсьлівалі **небясьпеку ўзброенага нападу на СССР з боку сусьветных імпэрыялістаў з Польшчай і Францыяй на чале.** У горадзе была пашырана значная колькасьць камуністычнай літаратуры і вывешана шмат чырвоных сьцягаў з рэвалюцыйнымі лёзунгамі. **Паліцыя правяла масавыя арышты.**

Дзень 1-га жніўня ў **Берасьці** прайшоў з вялікім уздымам. **Адбылося некалькі масовак, распаўсюджаны па ўсіх рабочых кварталах камуністычныя адозвы. На многіх вуліцах былі вывешаны чырвоныя сьцягі.**

У **Кнураве** (Познань) каля капальні кампартыя **склікала вялізарны мітынг,** на якім выступіў камуністычны прамоўца. Пасьля доўгай барацьбы паліцэйшчыне ўдалося разагнаць мітынг. **Некалькі рабочых паранена.**

Перад біржай працы ў **Сасноўцы** сабралася дэманстрацыя, у якой прымала ўдзел некалькі соцень рабочых. Прыбыўшая паліцыя жорстка расправілася з дэманстрантамі—беспрацоўнымі.

Сотні чырвоных сьцягаў разьвяваліся над Францыяй

ПАРЫЖ, 1. Як паведамляе **«Юманітэ»,** у Парыжы ў дзень 1-га жніўня было арыштавана 157 чал. Каля 75 проц. усіх шофэраў таксі па заклику унітарнага (рэвалюцыйнага) прафсаюзу спынілі рух паміж 12—4-ма гадзінамі па паўдні. У Мажык-Гілі (Парыж) рэвалюцыйнай арганізацыяй былых удзельнікаў вайны быў праведзен мітынг, на якім выступілі камдэпутат **Богран** і інш. прамоўцы. Паліцыя пры ўваходзе на мітынг правярала дакументы. Па вестках **«Юманітэ» арыштавана з розных прычын 250 чалавек.** У ліку арыштаваных—фатограф рэдакцыі «Юманітэ». У раёне цэнтральнага рынку адбыўся паход з чырвоным сьцягам, у якім прымалі ўдзел беспрацоўныя і хатнія гаспадыні. Дэманстранты патрабавалі «работы, або хлеба».

***

ПАРЫЖ, 2. «Юманітэ» ў перадавым артыкуле, падагульваючы правядзеньне дня 1-га жніўня ва Францыі, піша: «Буржуазія ўсіх краін, канстатуючы ў апошнія дні посьпехі ў падрыхтоўцы да 1 жніўня, прыходзіла ў ярасьць і пускала ў ход усе сродкі тэрору, каб задушыць дэманстрацыю рабочых мас. Але ўсё-ж **сотні чырвочых сьцягаў разьвяваліся па ўсёй краіне.** Дзесяткі камуністычных прамоўцаў выступалі ля брам фабрык і заводаў пад абаронай рабочых.



За кулісамі «разбросых» канфэрэнцый. На зд.: манэўры флёту і войск ПАЗШ

Наперакор забароне крывавых цэргібэляў

БЭРЛІН, 2. З усіх буйных цэнтраў Нямеччыны паведамляюць аб антываенных дэманстрацыях, якія там адбыліся. Дэманстрацыі праходзілі ў **Бэрліне, Лейпцыгу, Эсэне, Гамбургу, Аўгсбургу, Н'юрэнбэргу.**

У **Лейпцыгу** выступленьні пачаліся ў 4 гадзіны па паўдні. У часе дэманстрацыі, якая праходзіла ў цэнтры гораду, былі чутны воклічы супроць ураду і супроць імпэрыялістычнай вайны. Магазыны былі часова зачынены. Ва ўсіх частках гораду дэманстрацыі цягнуліся да 5-ці гадзін. Вялікая дэманстрацыя адбылася каля муніцыпалітэту.

У **Гамбургу** пры разгоне дэманстрацыі паліцыя ужыла **агнястрэльную зброю.** У **Аўгсбургу** антываенныя дэманстрацыі адбываліся да позьняга вечара. Фашысты, якія прабавалі справахаваць дэманстрантаў, былі зьбіты рабочымі. Адбылася сур'ёзная сутычка з паліцыяй. **З абодвух бакоў—шмат параненых.**

У **Нюрэнбэргу** выступленьні рабочых ня спыніліся праз увесь дзень. У Гале вялізарнае выступленьне рабочых адбылося на галоўным пляцы гораду. Паліцыя пусьціла ў ход супроць дэманстрантаў **агнястрэльную зброю. Шмат рабочых і некалькі паліцэйскіх цяжка паранены.** Масы дэманстравалі да позьняга вечара. Гэта была самая вялікая дэманстрацыя, якой у Гале да гэтага часу ня бачылі. У Эсэне дэманстрацыя цягнулася 2 гадзіны. З рабочых дамоў дэманстрантаў віталі воклічамі «няхай жыве чырвоны фронт». Паліцыя была ўзброена кулямётамі і вінтоўкамі, сур'ёзых сутычак ня было (ТАСС).

Штыкавыя атакі супроць рабочых дэманстрацый

Крывавае 1-е жніўня ў Аўстрыі

ВЕНА, 2. Ня гледзячы на забарону, увечары 1-га жніўня **ў рабочых раёнах Вены адбыліся масавыя дэманстрацыі.** На 20-ці лятучых мітынгах выступілі з прамовамі камуністычныя прамоўцы. Паліцыя некалькі раз атакоўвала дэманстрантаў, якія зноў зьбіраліся на новыя лятучыя мітынгі. Дэманстравала шмат сацыял-дэмакратычных рабочых. Мітынгі праходзілі пры вялікім спачуваньні мясцовага насельніцтва.

У раёне **Шпанау** 2 паліцэйскія, якія прабавалі арыштаваць дэманстрантаў, былі зьбіты абуранымі рабочымі. Першажнівеньскія дэманстрацыі адбыліся таксама ў 20 правінцыяльных цэнтрах. У **Інсбруку** наперакор забароне адбылася дэманстрацыя. **Паліцыя атакавала дэманстрантаў, прычым 8 рабочых былі жорстка зьбіты. У Лінцы адбыліся** крывавыя сутычкі паміж камуністамі і нацыянал-сацыялістамі (фашыстамі), якія мелі на дапамогу паліцыю і прабавалі разагнаць сход. Праведзены шматлікавыя арышты, 2 паліцэйскія, адзін фашыст і адзін камуніст паранены. **У Кобургу супроць дэманстрантаў былі кінуты войскі і паліцыя.** У прамысловым цэнтры **Брун** паліцыя, узброеная вінтоўкамі а прымкнутымі штыкамі прабавала разагнаць дэманстрацыю. Дэманстранты аказалі, аднак, рашучае супраціўленьне.

Выкліканыя на дапамогу курсанты школы жандармэрыі павялі супроць дэманстрантаў **правільную ваенную атаку. Шмат рабочых паранена.** Пасьля разгону дэманстрацыі да ночы адбываліся сур'ёзныя сутычкі паміж паліцыяй і рабочымі (ТАСС).

Газавыя бомбы супроць дэманстрантаў ў Лёс Анжэлёс

НЬЮ-ЁРК, 2. Паводле паведамленьня «Дэйлі Уоркер» у Чыкага ў дзень 1-га жніўня **ў масавых дэманстрацыях прынялі ўдзел 25 тысяч рабочых.** Дэманстрацыі адбываліся ва ўсіх буйных прамысловых цэнтрах краіны, у прыватнасьці ў цэнтры сталёвай і аўтамабільнай прамысловасьці цэнтральных і заходніх штатаў Амэрыкі і ў вугальным раёне (штаты Огайо, і Пэнсыльванія), дзе бастуюць 40 тысяч гарнякоў. Усюды 1-шажнівеньскія дэманстрацыі адбываліся пад лёзунгам **абароны Савецкага Саюзу, барацьбы супроць падрыхтоўкі імпэрыялістычнай вайны, барацьбы супроць беспрацоўя, зьніжэньня зарплаты, голаду, зьверскага прысуду, вынесенага ў Скотсборо (супроць 8 нэграў-рабочых).** Пры разгоне 2 дэманстрацый у Лёс Анжэлёс **паліцыя ўжыла сьлёзатачывыя бомбы.**

„У СССР перадавыя ідэі безадкладна ажыцьцяўляюцца"

А НА ЗАХАДЗЕ СУСТРАКАЮЦЬ ШАЛЁНАЕ ПРОЦІДЗЕЯНЬНЕ З БОКУ УЛАДЫ І ПРЭСЫ"

МАСКВА, 3. 30 ліпеня народны камісар замежных спраў **тав. Літвінаў** паладзіў сьнеданьне ад'яжджаючым у гэты дзень з СССР Бэрнарду Шоу і яго спадарожнікам. У разьвітальнай прамове за сьнеданьнем тав. Літвінаў, намякаючы на выказаную некаторымі з спадарожнікаў Бернарда Шоу думку аб тым, што савецкі ўрад праводзіць у жыцьцё «ля ўсе свае», а «чужыя» і ўжо «ня новыя ідэі», сказаў, у прыватнасьці, наступнае:

«Чужаземцы, якія наведваюць Савецкі Саюз, іншы раз заяўляюць, што нашы ідэі ня новыя, што ідэі гэтыя існавалі яшчэ да рэвалюцыі.

Нас нікольні не саромяць падобныя заўвагі. Мы зусім не прэтэндуем на аўтарскае права на нашы ідэі і прынцыпы. Мы не сьцьвярджаем, быццам з «первозданного» хаоса ствараем новую сацыяльную сыстэму, мы ні на хвіліну не забываем аб творчасьці перадавых розумаў грамадзкай думкі мінулых пакаленьняў. Нам усё роўна, чые мэтады мы ўжываем, калі гэтыя мэтады служаць дасягненьню пастаўленых нам мэт. Здаецца Катону належыць «изречение» аб тым, што «разумны можа чаму-небудзь навучыцца нават ад дурня, але дурань ніколі нічому не навучыцца нават ад разумнага». Сьледуючы гэтаму прынцыпу, мы заўсёды гатовы вучыцца ўсяму, што папала і ад каго папала, і мы задаволены, калі хто-небудзь вучыцца чаму-небудзь ад нас».

У адказнай прамове, вытрыманай у тоне шчырага спачуваньня сацыялістычнаму будаўніцтву СССР, **Бэрнард Шоу,** далучыўшыся да выказанай тав. Літвінавым думкі, указаў, што сапраўды ідэі, якія ажыцьцяўляюцца ў СССР, зьяўляюцца выразам лепшых надзей перадавых розумаў усіх часоў і ўсіх народаў. Але,—заяўляе Шоу, зварачаючыся да тав. Літвінава,—вялікая розьніца ў тым, што вы ператвараеце гэтыя ідэі ў жыцьцё і што, калі ў вас зьяўляюцца новыя перадавыя ідэі, дык **цэлы дзяржапарат, усе яго органы, друк і грамадзкасьць зараз-жа бяруцца за ажыцьцяўленьне гэтых ідэй,** у той час, як усякая перадавая ідэя ў нас у Англіі сустракае не спачуваньне, **а шалёнае процідзеяньне з боку улады і прэсы.**

„Савецкі Саюз—самая цікавая краіна ў сьвеце"

МАСКВА, 3. Перад ад'ездам за граніцу Бэрнард Шоу пакінуў наступныя старонкі прадстаўніку «Интуриста»: **«Савецкі Саюз самая цікавая краіна ў сьвеце для падарожніка. І краіна гэта становіцца з кожным тыднем, амаль з кожным днём усё цікавей і цікавей. Аказацца ў краіне, дзе няма лэдзі і джэнтльмэнаў, але дзе людзі прыяцелі, аказалася для нас, людзей капіталістычнага Захаду, зусім новым і выключна прыемным вопытам». «Заўтра,**—піша Шоу прадстаўніку «Интуриста»,—**я пакідаю краіну надзеі і варочаюся ў заходнія краіны роспачы».**

Антысавецкая правакацыя ў Аргентыне

Налёт на „Амторг", 160 служачых арыштавана

НЬЮ-ЁРК, 1. З Буэнос-Айрэсу паведамляюць, што **паліцыя зрабіла налёт на «Амторг». Арыштавана 160 служачых і узяты кнігі і перапіска.** Тэлеграмы маюць нясны характар і не паказваюць прычын налёту. «Нью-Ёрк Таймс» піша, што налёт адбыўся ў рэзультаце скаргаў аргентынскіх прамыслоўцаў, якія абвінавачваюць «Амторг» у дэмпінгу і ўжываньні «нясумленых мэтадаў канкурэнцыі».

Карэспандэнт агенцтва «Асошыэйтод прэс» зьвязвае налёт з кампаніяй, якую прэзыдэнт рэспублікі Урыбуру вядзе супроць камунізму. Паводле паведамленьня агенцтва «Асошыэйтэд прэс» паліцыя робіць налёты на кватэры супраціўнікаў «Амторгу».

Пачаўся допыт арыштаваных супраціўнікаў і прыступлена да разгляду дакумантаў, захопленых пры налёце на памяшканьне «Амторгу». Афіцыяльнага тлумачэньня прычын налёту не падаецца, але паводле паведамленьня «Асошыэйтэд прэс», «у розных заявах з поўафіцыяльных крыніц, апублікаваных газэтамі, «Амторг» абвінавачваецца ў эканамічнай вайне супроць аргентынскіх імпартэраў, якая вядзецца шляхам дэмпінгу на тавары».

НАПЯРЭДАДНІ ДНЯ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Аб правядзеньні Дня індустрыялізацыі 6-га жніўня 1931 г.

Пастанова Прэзыдыуму Менгарпрафсавету

Выходзячы з пастановы УсеЦСПС і ЦСПСБ аб правядзеньні дня індустрыялізацыі, Прэзыдыум МГСПС ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Дзень індустрыялізацыі правесьці пад знакам шырокай мабілізацыі працоўных гораду на выкананьне дырэктыў партыі па паляпшэньні культурна-бытавых умоў працоўных мас (паляпшэньне грамадзкага харчаваньня, ліквідаваньне прарыву ў прыгарадных гаспадарках па прапорцы і ўборцы раньніх культур, праверка ходу і паскарэньне скончэньня пабудовы жылдамоў, дзіцячых устаноў і г. д.).

З мэтай дачы магчымасьці ўсім рабочым і служачым удзельнічаць у выкананьні вышэй памянёных дырэктыў партыі і для поўнага і лепшага скарыстаньня ўсёй масы рабочых і служачых гораду,—ПАДТРЫМАЦЬ ініцыятыву рабочых і служачых прадпрыемстваў і устаноў гораду аб ператварэньні дня індустрыялізацыі ў масавы бальшавіцкі дэкаднік індустрыялізацыі, пачаўшы яго з 4-га жніўня.

Практычна правесьці гэты дэкаднік наступным парадкам:

1. 4-га ЖНІЎНЯ 1-шы дзень дэкадніка. Усе навучальныя ўстановы гораду, (курсы, ФЗВ, тэхнікумы і г. д.) робяць адзіны выхадны дзень і ствараюць масавы суботнік па выхаду ў прыгарадныя гаспадаркі і рабоце ў вызначаных аб'ектах работ у горадзе. Праверка і практычная дапамога па скончэньні і адрамантаваньні дамоў рабочых, дзіцячых устаноў, харчэвень, упарадкаваньне клюбаў, садоў і г. д.

2. 5 і 6-га ЖНІЎНЯ ўсе служачыя савецкіх, каапэрацыйных і гаспадарчых устаноў апрача гандлёвай сеткі, ствараюць кожны дзень для паловы служачых сваёй установы выхадныя дні (з тым, каб установа ўсё-ж працавала); і таксама ствараюць масавы выхад у прыгарадныя гаспадаркі і ў гарадзкія аб'ектыі работы, згодна вышэй памянёнаму.

3. 7 і 8 ЖНІЎНЯ ўсе прцаўнікі ўстаноў і арцеляй прамыслова-інвалідных каапэрацый ствараюць у абодвы дні адзі выхадныя дні і таксама арганізоўныя выхадныя дні і таксама арганізоўваюць масавыя выхады ў прыгарадныя гаспадаркі і гарадзкія аб'екты работы.

4. 9 і 10 ЖНІЎНЯ ўсе жыхары жактаўскіх дамоў і ўтрымацы членаў саюзаў ствараюць масавыя выхады ў прыгарадныя гаспадаркі і ў гарадзкія аб'екты работы.

5. З мэтай забесьпячэньня поўнай і бесьперабойнай работы прадпрыестваў, рабочыя скарыстоўваюцца на групах рабочыя скарыстоўваюцца на групах у вызначаныя выхадныя дні па пяці-дзеўцы, а ў каго адзіныя выхадныя дні, скарыстоўваюцца звычайна, як і ўсе ўстановы.

Прасіць арганізацыі прамыслова-інвалідных каапэрацый правесьці гэту работу забясьпечыўшы поўнае яе выкананьне.

Прапанаваць ФЗМК і Гар'аддзяленьням правесьці масавую растлумачальную работу сярод рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў, каб усю гэту працу ўвязваць з астатнімі мерапрыемствамі. (выкананьне прамфінпляну, аўладаньнетэхнікай, ліквідацыя няпісьменнасьці і г. д.).

Для кіраваньня і разьмеркаваньня ўсіх рабочых і служачых у дні суботнікаў выпучыць пяцёрку ў складзе: ад ГСПС — т. Додзіна, Камгас — Пінхасіка, Ад Гаржылсаюзу — Гальперына, ад Аб'яднаньня БКС — Вайцэховіча і прасіць прамсаюз выпучыць прадстаўніка.

Прапанаваць ФЗМК выпучыць брыгады па праверцы становішча разгортваньня работы аўладаньня тэхнікай і ажывіць работу арганізаваных гурткоў і арганізаваць новыя — дзе яшчэ не арганізаваны.

Прапанаваць усім клюбам і мастацкім установам мабілізаваць свае сілы на абслугоўваньне суботнікаў як у прыгарадных гаспадарках, так і па гарадзкіх аб'ектах.

Старшыням ФЗМК весьці сталы вучот і нагляд за ходам выкананьня гэтага мерапрыемства сваім прадпрыемствам і ўстановай.

Па скончэньні дэкадніка на прэзыдыуме падвесьці вынікі і абмеркаваць пытаньне аб скарыстаньні сабраных сродкаў ад суботнікаў.

На падставе пастаноў сходаў рабочых і служачых, прэзыдыум ставіць сваёй мэтай скарыстаць на ліквідаваньне прарыву ў прыгарадных гаспадарках 15-20 тысяч чалавека-дзён і 10-15 тысяч чалавека-дзён на аб'ектах работ у горадзе, (скончэньне дамоў рабочых, дзіцячых дамоў, ясляй, клюбаў і г. д.).

На лепшае правядзеньне дэкадніка індустрыялізацыі выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва Віцебскі і Гомельскі Гарпрафсаветы.

ПРЭЗЫДЫУМ МЕНГАРПРАФСАВЕТУ.

Калгас „Барацьба" паказвае нездавальняючыя тэмпы ўборкі

ШКЛОЎ. Калгас **«Барацьба»** зьяўляецца адным з старэйшых і буйнейшых калгасаў раёну. Гэты калгас павінен быў паказваць узоры прыкладнай працы іншым калгасам. На справе-ж гэта далёка ня так.

Сенаўборка ў калгасе «Барацьба» павінна была быць скончана 25 ліпеня. Між тым, на сёнешні дзень яшчэ ня скошана каля 20 гэктараў.

Да ўборкі азімых калгас прыступіў 28 ліпеня. **За два дні калгасам зжата толькі 25 гэктараў. Гэта ў той час, калі ў калгасе ёсьць 25 спраўных жнівярак.** Дае прычыны такіх тэмпаў?

Грамадзкая думка калгасьнікаў вакол уборкі не мабілізавана. Рабочыя пляны уборкі ўраджаю ня складзены. Апошняя пастанова Калгасцэнтру і НКЗ не распрацавана. Зьдзельшчына не замацавана.

Раённы штаб праверкі не зьвярнуў належнай увагі на гэты калгас і практычна мала зрабіў, каб дапамагчы ліквідаваць прарывы.

Брыгадзір «Зьвязды»
ВАСКАБОВІЧ.

Краязнаўцы павінны ўключыцца да складаньня пляну 2-ой пяцігодкі

Выходзячы з дырэктыў партыі і СНК, Дзяржплян праводзіць падрыхтоўчую работу па складаньні генэральнага пляну электрыфікацыі і пляну другой пяцігодкі. Генплян павінен даць ня толькі агульны малюнак разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР, але паказаць напрамак кожнага раёну і асобных галін гаспадаркі.

Відавочна, што на даным адрэзку часу вырашэньне гэтай задачы павінна стаць галоўнейшым зьвяном у рабоце ўсіх навукова-дасьледчых устаноў БССР і ўсіх навукова-дасьледчых ячэйкі, якія ў Апошні акадэмічны савет БАН асаблівае падкрэсьліў гэту задачу, як адказьнейшую ў чарговай рабоце інстытутаў БАН. Геалёгічны інстытут — адказьнейшы пункт у гэтай галіне — ударнымі тэмпамі разгортвае работу па дасьледваньні прыродных багацьцяў раёнаў БССР. Слаба разгорнута работа інстытуту эканомікі і раду іншых інстытутаў. Бясспрэчна, што гэта адставаньне трэба ліквідаваць у бліжэйшы час.

Было-б памылкова гэту работу ўскладаць выключна на дзяржаўныя навукова-дасьледчыя установы. Арганізаваны ўдзел у падрыхтоўцы да складаньня генпляну шырокіх рабочых мас, калгасьнікаў, савецкай інтэлігенцыі—заруука найбольшых посьпехаў. Краязнаўчыя арганізацыі а мясцох, як масавыя навукова-дасьледчыя ячэйкі, павінны зьвязацца з райплянам РВК і шырэй ці, вядучага пачатку ў эканамічным разьвіцьці ўсяго раёну і яго спэцыялізацыі. Які напрамак разьвіцьця сельскай гаспадаркі вызначаецца ў раёне. Якая ў аспэкце генпляну пяцігодкі мяркуецца прадукцыя сельскай гаспадаркі. Сілавыя ўстаноўкі раёну (патрэбы прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, бытавыя і іншыя). Якое электрабудаўніцтва неабходна ў раёне ў пэрспэктыве дзясяцігодзьдзя для задаваленьня патрэб усіх галін народнай гаспадаркі (магчымасьці і патрэбнасьці ў ім). Шляхі зносін у раёне (водныя, чыгуначныя, гужавыя) і як павінна пайсьці іх разьвіцьцё для забесьпячэньня разьвіцьця ўсяго раёну. Якое жыльлёва-бытавое і культурнае становішча раёну. Неабходныя мерапрыемствы па разьвіцьці новых населішч, паляпшэньні існуючых. Неабходнае будаўніцтва (школы,, больніцы, камунальнае будаўніцтва і г. д.)

Відавочна што для ўдзелу ў гэтай адказьнейшай рабоце павінны быць прыцягнуты самі непасрэдныя работнікі на тэй ці іншай галіне, якія з вопытам сваёй работы дадуць багацейшы матар'ял.

Краязнаўчыя арганізацыі па мясцох на канкрэтных пытаньнях павінны шырока разгарнуць работу, дабіваючыся росту сваіх радоў за лік рабочых і калгасьнікаў. Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны ўсямерна дапамагчы краязнаўчым арганізацыям у гэтай важнай рабоце.

Гэтымі днямі мы атрымалі матар'ял з Асіпавіч. Як відаць з матар'ялаў, краязнаўчая ячэйка пры ФЗС прарабіла вялікую работу па вывучэньні эканомікі раёну. Гэта краязнаўчая ячэйка шчыльна падышла і да падрыхтоўчай работы па складаньні другой пяцігодкі. Праробленa значная праца па дасьледваньні прыродных багацьцяў і ў прыватнасьці па пытаньнях тоффарасправацовак. Краязнаўчая ячэйка асіпавічкай ФЗС на правільным шляху, яе работа заслугоўвае **перайманьня.**

Ударныя тэмпы будаўніцтва патрабуюць ударных тэмпаў і ў навуковай рабоце.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва павінны стаць асноўным мэтадам паходу краязнаўчых арганізацый за генплян і плян другой пяцігодкі.

Прафарганізацыі выказваючы з дырэктывы прэзыдыуму ЦСПСВ, павінны прыцягнуць краязнаўчыя таварыствы да разгортваньня масавай навукова-дасьледчай работы на прадпрыемствах, увязваючы гэта пытаньне з паходам за аўладаньне тэхнікай. Навучальныя ўстановы і школы канкрэтную работу па падрыхтоўцы да генпляну павінны цесна зьвязаць з барацьбой за палітэхнічную школу.

Трэба арганізаваць прэміяваньне лепшых ударнікаў, лепшых энтузіястаў-арганізатараў найшырэйшых мас на барацьбу за генэральны плян народнай гаспадаркі. В. Серафімаў.

Удзельнікі ўсебеларускага агітвэлёпрабегу.

Павысіць тэмпы электрыфікацыі сельскай гаспадаркі

Эканамічны савет прызнаў зусім нездавальняючым выкананьне пляну электрыфікацыі сельскай гаспадаркі БССР. **Белсельтрэст, Белкалгасцэнтр, Сьвінаводтрэст** і кіраўнікі некаторых калгасаў і саўгасаў яўна недаацэньваюць значэньня электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. **Наркамзем, Віцебскі гарсавет, Аршанскі і Дубровенскі райвыканкомы і Белканторa «Союзсельэлектро»** ня ўжылі належных мер да забесьпячэньня будаўніцтва па сельскай электрыфікацыі неабходнымі матар'ялам.

ЭКАСА прапанаваў Белканторы «Союзсельэлектро» праводзіць работу па электрыфікацыі сельскай гаспадаркі камплектна і ўжыць усе меры, каб закончыць мантажы 1931 г. у вызначаныя тэрміны. Белдзяржснаб і Белсельгаснаб абавязаць забясьпечыць будаўніцтва па сельскай электрыфікацыі адпаведнымі матар'ялам.

Белсельтрэсту, Белкалгасцэнтру, Сьвінаводтрэсту даручана ўзмацніць завоз с.-г. машын і прылад з тым, каб рашуча фарсаваць будаўніцтва па электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

Прэміяваньне работнікаў МТС

Беларускае аддзяленьне Трактарацэнтру пастанавіла прэміяваць рад працаўнікоў за ласьпяховае выкананьне пляну веснавой сяўбы.

Прэміі ў 100 руб. выданы дырэктару Мсьціслаўскай МТС—тав. Рагачову, Лепельскай МТС—Бадукову, Слуцкай МТС—Петрашэвічу, старэйшаму аграному Койданаўскай МТС—Бялінскаму, мэханіку Шклоўскай МТС—Іодзька, мэханіку Капыльскай МТС—Хвалею і сакратару Беладдзяленьня Трактарацэнтру—Кастрову.

Дырэктару Танежыцкай МТС выдана прэмія ў разьмеры 140 руб.

У Беларускай Акадэміі Навук

— Прэзыдыум БАН арганізаваў **сэктар масавай працы** Акадэміі Навук. Загадчыкам сэктару назначан тав. **Серафімаў.**

— На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму разгледжана пытаньне аб пабудове **Боркаўскага санаторыя** (Полаччына). Вылучана камісія ў складзе акадэмікаў **Кроля,** праф. **Бліодуха, Ляндэра, Ермаленкі і Крукоўскага,** якой даручана скончыць да 1 лістапада ўсю падрыхтоўчую работу, зьвязаную з будаўніцтвам санаторыя.

— У бягучым годзе адбудуцца два пленумы акадэмічнага савету БАН па буйнейшых прадпрыемствах Менску. Першы пленум будзе скліканы у кастрычніку, другі ў сьнежні.

Папраўка

У перадавым артыкуле **«Кампаніі ўборкі тэхкультур—бальшавіцкае кіраўніцтва»** («Зьвязда» ад 31 ліпеня) па віне друкарні груба скажон сэнс апошніх радкоў 14-га абзацу. Замест слова—**выкараняючы** набрана слова **—выкарыстоўваючы.** Гэтыя радкі трэба чытаць так:

Вясковыя партарганізацыі павінны павярнуцца тварам да будаўніцтва і забясьпечыць перамогу на гэтым баявым вучастку, рашуча **ВЫКАРАНЯЮЧЫ** правааапартуністычную практыку.

Паведамленьні

— 4 жніўня 1931 г., у 6 гадзін вечара, у памяшканьні Аб'яднанага Бюро скаргаў ЦКК НК-РСІ Бел. (Савецкая, 55, 1 паверх) адбудзецца пасяджэньне Аб'яднанага Бюро скаргаў ЦКК НК-РСІ з разглядам наступных спраў: 1. Справа інжынэра Круглікa-Ашчэўскага; 2. Справа Калінкавіцкай чыгуначнай школы ФЗС; 3. Справа настаўніка Горыстаў; 4. Справа выдавецтва «Маскоўскі рабочы»; 5. Справа Белптушкі; 6. Справа насенсаўгасу «Канстанцінава»; 7. Справа настаўніцы Багдановіцкай. Усе тавэрышы, якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі т. т. Пэўзаноў, Брэгман, Ліўшыц—(фабрыка «Кастрычнік»); Гольдбэрг, Кажура, Мацюлевіч—(гута «Пралетары»); Жыжэмскі, Сьлесар, Бацьвінік, Кузьміноў—(абутковая фабрыка).

— Цэнтральны савет валуўнічых блаславенстваў БССР просіць зьявіцца на нараду 5 жніўня, у 8 гадз. веч., у памяшканьні польсэктару БАН наступных т. т.: Зарэмбскага, Астапэўскага, Бакштэйн, Харэўскага, Міклуша, Вітковскага, Квяткоўскага, Мястоўскую, Анджыеўскага, Сляніцкага, Мэтэ (ЦПТ), Гурэвіча (Гарсавет ОВБ).

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Першая гукавая мастацкая карціна **Пуцёўка ў жыцьцё** Драма ў 34 эпізодах

Культура — Пач. 7.8-45;10-30 — З 1 жніўня мастацкі фільм **ЖОНКА** Звыш праграм. часопіс Белдзяржкіно

„Пралетары" — Ядкр. з 12 г. дня. — 2 сэрыі, 18 част. у адзін сэанс **СТЭНЛЕЙ** у нетрах Афрыкі.

„ЮНЫ ПІЯНЭР". — Гэтымі днямі ў памяшканьні кінатэатра „Культура" адбудзецца адкрыцьцё кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР" **сачэце за рэкламай.**

„СПАРТАК" — Пач. у 7-15, 9,10-45 Каса—з 5 гадз — Выдатны фільм з жыцьця хунгуза у **ІМСЬЦІВЕЦ** драма ў 7 частках

Беларускае аддзяленьне „АБШ" і Беларускі Цэнтральны Савет Асоавіяхіму паведамляюць, што ў **БЕЛАРУСКІ ТЭХНІКУМ** па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі ў сельскай і лясной гаспадарцы і па вывучэньні хімічнай справы

ПРЫЁМ ЗАЯЎ **ПРАЦЯГНУТ** ДА 15-га ЖНІЎНЯ г. г.

Прымаюцца без іспытаў асобы скончыўшыя 7-годкі, ШКМ і інш. навучальныя ўстановы адпаведнай асьветы. Усе ячэйкі Асоавіяхіму, МІС і МІП Бел. АБШ павінны накіроўваць заявы з анкетаю і дакумантамі вылучаных кандыдатур непасрэдна ў канцылярыю тэхнікуму па адрасе: г. Віцебск, пляц Волі, д. № 1, Беларускаму тэхнікуму АБШ.

Там-жа да паказаньня тэрміну будуць прымацца заявы з анкетаю і дакумантамі і ад грамадзян, якія не зьяўляюцца членамі Асоавіяхіму, але жадаюць паступіць у тэхнікум, і маюць адукацыю на ніжэй 7-годкі з дакумантамі, згодна даведніку НКАсьветы.

З прыёму прыёму можна азнаёміцца на раёнах у райсаветах Асоавіяхіму і ў МІС і МІП Бел. АБШ.

Аб залічэньні, вызначэньні стыпэндыі і пачатку заняткаў—тэхнікумам будзе паведамлена кожнаму асабіста.

Беларускае аддзяленьне АБШ
Беларускі Цэнтральны Савет Асоавіяхіму

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" З 3-га жніўня Дуглас ФЭРБЕНКС у карціне **ТРЫ МУШКАЦЕРЫ** Паводле раману Дзюма ў 12 частках. Пачатак 1 сэансу ў 7 гадз. Каса адкрыта з 5 гадз.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт абвяшчае асеньні набор студэнтаў на наступныя факультэты:
1. Фізыка матэматычны (беларуск. і ўкр. сэкцыі)
2. Хімічны (беларуск. сэкцыя)
Заявы прымаюцца **да 20 жніўня г. г.** у канцылярыі БДУ (Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус).
Іспыты для тых таварышоў, якія ня маюць сярэдняе асьветы, будуць праводзіцца 27, 28 і 29 жніўня. Правілы прыёму абвешчаны ў даведчыку НКА.
70 проц. прынятых студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Для самой студэнтаў БДУ кватэр не прадстаўлае.
Аб тэрміне пачатку заняткаў з новым наборам будзе паведамлена асобна.
ЧВП Рэктара БДУ **В. Рудзіцкі.**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЧЫНОЎНІК. Усім старшыням, ФЗН, старшыням навпбюро і прадсетачнікам заводакіраўніцтваў. Праўленьне МЦРК 5-га жніўня, у 7 гадз. веч., у клюбе Белкавасаюзу (Савецкая, 43, ва двары Белкавасаюзу) склікае Інструкцыйную нараду ўсіх старшынь навпбюро, прадстаўніноў ФЗН і заводакіраўніцтваў і навпарганізатараў, з наступным парадкам дня:
1) Аб выдачы новых наборных картак носьбіцтву г. Менску.
2) Аб правядзеньні месячніка барацьбы з чаргамі.
З прычыны важнасьці пытаньняў, **яўка** ўсіх вышэйпералічаных **абавязкова.**
Гарпрафсавет і праўленьне МЦРК.

Калінкавіцкая школа ФЗВ (б. школа МТП) аддзелу кадраў дырэкцыі Зах. чыг. абвяшчае асеньні набор на цягавае аддз